КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 26 (249) ◂ 1 ліпеня ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144




**ПЁТРА МУРЗЁНАК**

Стар. 14–15

**ПАЖАР НА БАЛОЦЕ**

Чэрвеньскае апытанне Незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў паказала абвал даверу да ўлады

Стар. 4

**МЯЦЕЖНЫ СТЭП**

Казахстан і краіны Сярэдняй Азіі святкуюць 95-годдзе паўстання 1916-га — самага вялікага ў гісторыі мусульманскага паўстання супраць расійскай каланізацыі

Стар. 12

**САЎКА І ГРЫШКА АДСВЯТКАВАЛІ...**

Стар. 11

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**«САЦЫЯЛЬНЫ НЕРАТ»**

Нарыс Марыйкі Мартысевіч

▸ **АД РЭДАКТАРА**

# КРЭДЫТЫ І САНКЦЫІ

*Аляксей КАРОЛЬ*

**Менавіта гэтыя словы вызначаюць дзве асноўныя лініі палітыкі адносна Беларусі з абодвух бакоў — як з Захаду, так і з Усходу. У розных перакрыжаваннях і спалучэннях у розныя перыяды. Далёка не заўсёды ў адпаведнасці з устойлівым стэрэатыпам: санкцыі — з Захаду, крэдыты — з Расіі.**




Узгадаем хаця б крэдыт ад МВФ у 2008 годзе, які, па ацэнках многіх экспертаў, выратаваў рэжыму Лукашэнкі. І адначасова — шэраг расійска-беларускіх газавых, нафтавых, малочных «войнаў», затрымак з пастаўкамі нафты. Усё гэта, па сутнасці, не што іншае, як элементы санкцый — эканамічных і палітычных, замаскіраваных шыльдамі ўзгаднення коштаў, разліку крытыраў і г. д.

Сваю плату за лаяльнасць (па ацэнцы Пуціна — 50 мільярдаў), за абяцанкі і падманы Крэмль палічыў занадта завышанай, і крута развярнуў рулю ў бок эканамічных санкцый, падмацаваных інфармацыйнымі залпамі. І за нейкія два-тры гады дамогся сваіх мэтаў — паставіў афіцыйны Мінск у пазіцыю амаль поўнай васальнай залежнасці. Рэжым супраціўляецца, Масква — дацiскае.

Апошні крэдыт ад ЕўрАзЭС (лічы, ад Расіі, якой у антыкрызісным фондзе гэтай арганізацыі належыць кантрольны пакет) для Беларусі адносна невялікі па сваіх памерах і абстаўлены шэрагам умоў. Яго агульная сума — 3 мільярда долараў, якія да таго ж падзелены на тры траншы да 2013 года. Між тым як у прорве валютнага крызісу Лукашэнку патрэбныя (яшчэ і замала) усе тры, і адразу.

Першы транш — 800 мільёнаў долараў — у Беларусь ужо прыйшоў. Астатнія ж расійскім бокам пастаўлены пад пытанне. Пад пытанне паставіла і магчымасць выдзялення 1 мільярда крэдыту кіраўніцтва «Уралкалія», абяцанага за прэферэнцыі па куплі прадукцыі «Беларускалія» (а там, глядзіш, і прыватызацыі самога прадпрыемства). І яшчэ адзін свежы ўдар — спыненне паставак у Беларусь электраэнергіі за даўгі.

Зразумела, што гэта не ёсць усяго толькі адказ на «наезд» беларускага тэлебачання на прэзідэнта Расіі. Колькі іх было за гады «братэрскіх адносін»! Гэта не болей чым нагода, усяго толькі маленькі эпізод са шматходовай аперацыі Крамля па ўдушэнні рэжыму Лукашэнкі эканамічнымі сродкамі. Сродкамі эканамічных санкцый. Сітуацыя саспявае, мадэль беларускага эканамічнага цуда, якое падтрымлівалася субсідыямі з Расіі, церпіць крах. Не выпадкова, менавіта ў гэтыя дні НТВ выпусціла на экраны перадачу, якая анатаміруе гэты крах.

Палітычны сэнс, на першы погляд чыста эканамічнай канфігурацыі крэдытавання Крамлём рэжыму Лукашэнкі, робіцца абсалютна празрыстым у абрамленні ўмоў апошняга крэдыту. Галоўная з умоў — прыватызацыя беларускіх актываў на суму 7,5 мільярда долараў — па 2,5 мільярда ў год. Відавочна, што Расія высцілае сабе шлях да прыватызацыі найперш нафтавай і газавай трубы, нафтаперапрацоўчых прадпрыемстваў, салігорскага калійнага комплексу, а таксама МАЗа ў прыдачу. А гэта ўсё — асновы беларускай эканомікі ў яе сённяшняй, цалкам адзяржаўленай форме, а з тым і аснова аднаасобнай вертыкалі ўлады А. Лукашэнкі.

Калі б расійская палітыка стварала пагрозу толькі рэжыму, гэта была б адна сітуацыя. Але драматызм расійскай палітыкі ў адносінах да Беларусі палягае ў яе гістарычна непахіснай імперскай традыцыі. Магчыма, у сучасных геапалітычных варунках Расія ўжо і не пасягае на інкарпарацыю Беларусі ў свой склад у якасці Паўночна-Заходняга краю. Але ці лепшым для нашай краіны выглядае лёс пераўтварыцца ў фармальна суверэнны дадатак Расіі? А з тым, што яшчэ трагічней, — у палубу сухапутнага авіяносца, скіраванага на Захад?

Гэта памылковы стэрэатып, што высілкі Крамля па ўтрыманні ў сваёй арбіце Беларусі ёсць не болей чым праява застарэлай імперскай псіхалагічнай траўмы ў палітычным менталітэце расійскай кіроўнай эліты. Наадварот, гэта эліта будуе сваю палітыку на чыста прагматычнай аснове. Яна разумее, што Расія як вялікая дзяржава здольная аказваць істотны ўплыў на сусветную, асабліва еўрапейскую, палітыку, немагчымая без Беларусі, гэтак жа, як і без Украіны.

Па еўрапейскіх мерках, Беларусь не такая ўжо і маленькая краіна. Яе тэрыторыя ў сукупнасці з геаграфічным становішчам, яе рэсурс — людскі, эканамічны, палітычны і ваенны — дадасць Расіі тую вагу, якая імгненна запатрабуе істотных карэктыў сваёй знешняй палітыкі ад Еўрасаюза. Замацаванне Беларусі за сабой мае для Крамля і гістарычны кантэкст геапалітычнага суперніцтва з Польшчай. Без Беларусі яшчэ больш аддаляецца ад карэннай расійскага мацерыка яе калінінградская выспа. І толькі пры ўмове сапраўднай дэмакратычнай мадэрнізацыі Расіі, ёй спатрэбіцца сапраўды дэмакратычная Беларусь у якасці сапраўды незалежнай, добрасуседскай краіны.

Ну а што Захад, з яго дыялогамі, санкцыямі і крэдытамі? Дыялогавы шлях цалкам перакрэслены А. Лукашэнкам брутальным разгромам плошчы 19 снежня мінулага года, судамі над сваімі палітычнымі апанентамі і не сціхаючымі да гэтага часу рэпрэсіямі супраць іншадумцаў.

Еўрасаюз адказаў санкцыямі. Напачатку толькі палітычнымі. Унутраныя спрэчкі пра мэтазгоднасць увядзення эканамічных санкцый цягнуліся да 20 чэрвеня.

**Працяг на стар. 5** ▸

АПАЗІЦЫЯ

# ЧАРГОВАЕ АБ'ЯДНАННЕ

Вольга ХВОІН

**Шэраг апазіцыйных палітычных структур падпісалі пагадненне аб каардынацыі сумеснай дзейнасці. «Мы хочам, каб аб'яднанне дэмакратычных сіл праходзіла менавіта праз канкрэтную сумесную працу, а не толькі сустрэчы», — заявіў старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька.**

Шэсць палітычных структур — Рух "За Свабоду", кампанія «Гавары праўду», АГП, партыя левых «Справядлівы свет», партыі БХД і БНФ — заявілі, што яны змаглі паразумецца па двух пытаннях: першаснае патрабаванне вызвалення палітычных вязняў і патрабаванне стварыць умовы для правядзення свабодных дэмакратычных выбараў.

Варта зазначыць, што да заявы аб кансалідацыі апазіцыі з боку журналістаў была вялікая ўвага і чаканне калі не прыняцця радыкальных рашэнняў, то хаця б канкрэтыкі адносна стратэгіі дзеянняў. Аднак гэтага не прагучала. Не было анансавана і супольнае рашэнне пра ўдзел у парламенцкіх выбарах ці іх байкатаванне.

Аляксандр Мілінкевіч заявіў, што ў крызісе сёння знаходзіцца не толькі краіна і ўлада, але ў пэўнай ступені і апазіцыя. «Гэта адбылося таму, што мы слаба аб'ядналіся. Нам неабходна накіраваць сумесныя дзеянні на дэмантаж сённяшняй сістэмы ўлады, першы крок да чаго — правядзенне свабодных выбараў», — сказаў палітык.

Аўтары пагаднення мяркуюць, што ў Беларусі неабходна правесці поўнамаштабную палітычную рэформу.

«Адзіным сведчаннем правядзення такой рэформы могуць стаць празрыстыя выбары, дэмакратычны характар якіх быў бы прызнаны як усімі палітычнымі сіламі і ўдзельнікамі электаральнага працэсу ўнутры Беларусі, так і міжнароднымі арганізацыямі. Такія выбары дазволілі б сфарміраваць паўнамоцны парламент і адказны перад народам урад, які б змог правесці неабходныя эканамічныя рэформы, — гаворыцца ў дакуменце. — Эканамічны крызіс быў абвостраны крызісам палітычным. Сістэматычныя парушэнні вышэйшым кіраўніцтвам краіны заканадаўства, скіраваныя на ўзмацненне рэжыму асабістай улады, прывялі да празмернай канцэнтрацыі паўнамоцтваў у руках аднаго чалавека, разбурэння балансу галінаў улады».

Удзельнікі пагаднення гавораць, што іх кансалідацыя мае адкрытую форму, яны чакаюць салідарнасці і паразумення з іншымі партыямі і арганізацыямі.

Кіраўнік партыі левых на пытанне, якім чынам будзе арганізаванае кіраўніцтва ў новастворанай платформы, заявіў: «Вы ўсё хочаце стварыць КПСС. Але каардынацыя дзейнасці магчымая і так».

Разважаючы пра лідарства, палітыкі выказаліся, што цяпер не стаіць пытанне выбару новага «прыгожага і разумнага» лідара, аднак, па словах Мілінкевіча, такога было б мець някепска.

СУД

# ЖУРНАЛІСТУ ПАГРАЖАЮЦЬ ТУРМОЙ

**5 ліпеня можа быць абвешчаны вырак суда па справе журналіста Андрэя Пачобута.**



Андрэй Пачобут

У Гродна прайшло шостае па ліку судовае пасяджэнне па справе журналіста Андрэя Пачобута. Крымінальную справу завялі за публікацыі журналіста: восем з «Gazety Wyborczej» і дзве з інтэрнэту — з сайта «Беларускі партызан» і асабістага блогу Андрэя на livejournal.com. Абвінавачванне прад'яўлена па двух артыкулах Крымінальнага кодэксу: «абраза» і «паклёп» у адносінах да прэзідэнта. Пракурор прасіць для Пачобута 3 гады зняволення. Судовы працэс ужо амаль месяц праходзіць у закрытым рэжыме. Наступнае пасяджэнне прызначанае на 5 ліпеня. Чакаецца, што ў гэты дзень журналіст Андрэй Пачобут зможа сказаць сваё апошняе слова, і яму будзе абвешчаны прысуд.

«Мы чакаем канчатковага выніку разгляду па справе польскага журналіста Анджэя Пачобута», — сказаў пасол Польшчы ў Беларусі Лешака Шарэпку на прэс-канферэнцыі ў Мінску. Ён зазначыў, што раней Польскі МЗС агучыў сваю пазіцыю наконт судовага пераследу журналіста за яго прафесійную дзейнасць. І гэты пункт гледзішча не змяніўся.

Раней міністр замежных спраў Польшчы Радаслаў Сікорскі заявіў, што карэспандэнт польскай «Gazety Wyborczej» Андрэй Пачобут стаў закладнікам польска-беларускіх адносін. «Андрэй Пачобут — грамадзянін Беларусі польскага паходжання, якога, незалежна ад таго, што ён сам робіць, Аляксандр Лукашэнка выкарыстоўвае для камунікацыі з урадам Польшчы», — адзначыў кіраўнік польскага МЗС. Паводле яго слоў, такія паводзіны «зусім не прымальныя», і Польшча «не паддасца на шантаж і будзе працягваць абараняць усіх вязняў сумлення».

Радаслаў Сікорскі заявіў, што арышт Андрэя Пачобута на падставе "абсурдных абвінавачванняў" з'яўляецца прыкладам «дрэннай палітыкі беларускіх уладаў, якая наносіць шкоду іміджу краіны». Са свайго боку, кіраўнік МЗС Польшчы падпісаўся пад патрабаваннем рэдакцыі «Gazeta Wyborcza» аб вызваленні Пачобута, а таксама выказаў падзяку старшыню Еўрапарламенту Ежы Бузеку, прэзідэнту ЗША Бараку Абаму і іншым палітыкам, якія настойваюць на вызваленні польскага журналіста.

ПРАТЭСТ

# НАС УСЁ БОЛЬШ

**160 удзельнікаў акцыі маўклівага пратэсту «Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі» затрыманыя ў Мінску, каля 200 — у рэгіёнах.**

Акцыі маўклівага пратэсту прайшлі ў абласных цэнтрах, а таксама ў Ваўкавыску, Смаргоні, Баранавічах, Маладзечне, Дзяржынску, Маларыце, Жодзіна, Жлобіне, Наваполацку, Салігорску, Мёрах, Чавусах — і яшчэ амаль у 40 гарадах.

Акцыя 29 чэрвеня стала ўжо чацвёртай па ліку. Па ініцыятыве актывістаў інтэрнэт-супольнасці мірныя акцыі пратэсту праходзяць кожную сераду пачынаючы з 8 чэрвеня на галоўных плошчах беларускіх гарадоў. Людзі не скандзіруюць лозунгаў і заклікаў, а проста збіраюцца разам і час ад часу апладзіруюць, выказваючы такім чынам сваю нязгоду з палітыкай кіраўніцтва краіны.

28 чэрвеня актывісты інтэрнэт-супольнасці «Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі» заклікалі ўлады спыніць правакацыі і не перашкаджаць выказванню мірнага пратэсту грамадзян. Аднак за некалькі гадзін да пачатку акцыі ў цэнтр Мінска зноў былі сцягнуты сілы міліцыі. На Кастрычніцкай плошчы, абгароджанай турнікетамі, праходзіла дыскатэка БРСМ. Як і ў мінулы раз, большая частка затрыманняў праводзілася ў раёне вуліцы Няміга і праспекта Пераможцаў.

30 чэрвеня пачаліся суды над затрыманымі. На момант выхаду газеты было вядома, што ў судзе Савецкага раёна Мінска Паліна Кур'яновіч атрымала 15 сутак арышту (арт. 17.1 КаАП РБ; суддзя Паўлючук), Ягор Казей — штраф 25 базавых велічынь, Максім Сарычаў — 20 б.в. (суддзя — Паўлючэнка), Валерый Тумілевіч — 20 б.в. У судзе Ленінскага раёна Мінска Аляксей Дудар атрымаў штраф у 25 б.в. (суддзя Навіцкі), Ханеня Віктар — 25 б.в. (суддзя Навіцкі), К. Нічыпар — 20 б.в. (суддзя Навіцкі), Аляксей Астапенка — 10 сутак арышту (суддзя Міхаіл Хома), Яўген Шыманскі — 14 сутак (суддзя Міхаіл Хома), Юра Бакур — 15 сутак арышту (суддзя Міхаіл Хома).

У Фрунзенскім судзе ўсе матэрыялы па адміністратыўных справах на 8 затрыманых адпраўленыя на дапрацоўку ў РУУС.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# «ПРЫЧЫНА СМЕРЦІ»

Генадзь КЕСНЕР

**Прэзентацыя дакументальнага фільма «Прычына смерці» прайшла ўвечары 29 снежня ў сталічнай «Галерэі «Ў».**

Стужка, якую зняў рэжысёр Віктар Трацякоў па сцэнары Паліны Сцепаненкі, створана ў рамках кампаніі «Праваабаронцы супраць смяротнага пакарання».

Беларусь з'яўляецца адзінай краінай не толькі ў Еўропе, але нават і на постсавецкай прасторы, дзе дагэтуль прымяняецца смяротнае пакаранне. З гэтай прычыны Беларусь адначасова з'яўляецца і адзінай краінай на кантыненце, якая не ёсць сябрам Савета Еўропы. Кіраўніцтва нашай дзяржавы і сёння адмаўляецца не толькі забаранiць расстрэлы як вышэйшую кару за найцяжкія злачынствы, але нават увесці мараторый на яе прымяненне.

Як паказваюць аўтары фільма, у Беларусі вакол смяротнага пакарання створана сапраўдная таямнічая завеса. Родным прыгавораных да расстрэлу не паведамляюць дату выканання прысуду, не выдаюць цела пакаранага, нават не кажуць, дзе расстраляны знайшоў свой апошні прытулак.

У фільме распавядаецца пра сям'ю жыхара Салігорска Андрэя Жука, які за забойства быў прыгавораны да смяротнага пакарання. 19 сакавіка 2010 года Святлана Жук прывезла сыну перадачу ў следчы ізалятар №1 на вуліцы Валадарскага ў Мінску. Але перадачу не прынялі, ахоўнік толькі сказаў: «Не шукайце яго нідзе. Адбыў па месцы выканання прысуду». Святлана Жук зразумела, што сына ўжо расстралялі. Яна шукала яго магілу на гарадскіх могілках сярод магіл без апазнавальных надпісаў. У турме ёй выдалі толькі рэчы сына. «Святар правёў адпяванне і сказаў, каб мы пахавалі яго рэчы ў магілу кагосьці з блізкіх і пасыпалі яе свянцонай зямлёй. Мы так і зрабілі», — распавядае, плачучы, Святлана Жук.

У ЗАГСе Салігорску 1 чэрвеня Святлане Жук пасля доўгіх мытарстваў нарэшце выдалі пасведчанне пра смерць сына. У паперцы стаіць дата яго смерці — 18 сакавіка 2010 года, у графе «прычына смерці» — прочырк…

Юрыст, намеснік старшыні незарэгістраванага Праваабарончага цэнтру «Вясна» Валянцін Стэфановіч падкрэсліў, што нават у Канстытуцыі Беларусі смяротнае пакаранне азначана як часовая мера, якая выкарыстоўваецца да яе адмены. Так што ўсе спасылкі высокапастаўленых чыноўнікаў на тое, што адмяніць смяротную кару вельмі складана, бо дзеля гэтага трэба ўносіць змены ў Асноўны закон краіны праз рэферэндум, не вытрымліваюць аніякай крытыкі.

ПРАБЛЕМА

# ІНВАЛІДНАСЦЬ — НЕ ВЫРАК

Аляксандр ТАМКОВІЧ

**У будынку па сталічнай вуліцы Варанянскага, 50/4 у 101-м пакоі пачаў працаваць Офіс для людзей з інваліднасцю.**

Праект унікальны для Беларусі, бо ў такім выглядзе нічога падобнага ў нашай краіне раней не было. Дакладней, падобныя спробы мелі месца, але ўсе яны насілі лакальны і пераважна кароткачасовы характар. Офіс для людзей з інваліднасцю, на чым акцэнтавалі ўвагу яго арганізатары падчас прэзентацыі, бачыць сваю задачу ў тым, каб пастаянна, штодзённа, не на словах, а практычнай дапамогай адстойваць правы тых, хто з-за хваробы апынуўся як бы па-за бортам звычайнага жыцця.

Па дадзеных асноўнага каардынатара і ідэйнага лакаматыва праекту Сяргея Драздоўскага, пра чыё жыццё мы маем намер падрабязна расказаць, сёння ў Беларусі зарэгістравана 504,4 тысячы чалавек з інваліднасцю.

Дапамагчы ім стаць раўнапраўнымі сябрамі беларускага грамадства — адна з галоўных мэтаў працы Офісу — новай асветніцка-праваабарончай структуры. Больш падрабязна даведацца аб яе працы можна на сайце www.disright.org.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ЛЕДЗЬ НЕ ЎЛІПЛІ Ў НОВУЮ ВАЙНУ

Сяргей САЛАЎЁЎ




**Беларусь ледзь не ўліпла ў новую вайну з Расіяй. На гэты раз — «электрычную». Ва ўмовах дэфіцыту валюты Беларусь не выканала сваіх абавязкаў — на гэты раз не перад «Газпромам», а перад расійскім ААТ «Інтэр РАО ЕЭС». Беларусь не пералічыла чарговы транш за электрычнасць, якую Расія пастаўляе ў Беларусь. З гэтага электрычнасць нам абрэзалі.**

На 22.00 аўторка плацеж у памеры 600 мільёнаў рублёў (21,3 мільёна доляраў ЗША) не паступіў, і ў 00.00 29 чэрвеня ААТ «Інтэр РАО ЕЭС» цалкам абмежавала пастаўкі электраэнергіі ў Беларусь.

Урад Расіі чакаў, што Мінск загасіць запазычанасць за спажытую электраэнергію ў бліжэйшы час, і яе пастаўкі ў краіну будуць ажыццяўляцца ў нармальным рэжыме, заявіў журналістам у Маскве 28 чэрвеня віцэ-прэм'ер РФ Ігар Сечын. Ён адзначыў, што доўг Беларусі за пастаўкі электраэнергіі ў сакавіку — маі складае каля 1,2 мільярда расійскіх рублёў і за чэрвень можа вырасці яшчэ на 400 мільёнаў.

Сечын таксама паведаміў, што па стане на 24 чэрвеня Беларусь пералічыла кампаніі «Інтэр РАО ЕЭС» каля 8 мільёнаў рублёў, або 1,3% ад наяўнага доўгу.

Віцэ-прэм'ер падкрэсліў: планаванае абмежаванне паставак электраэнергіі ў Беларусь не мае палітычнай падаплёкі — гаворка ідзе аб узаемадзеянні энергетычных кампаній. Гэта «абсалютна рынкавыя працэсы: электраэнергія павінна быць аплачана», заявіў Сечын.

Праблемы з пастаўкамі ўзніклі з-за крызісу на валютным рынку. Канцэрн «Белэнерга» сутыкнуўся з праблемай канвертацыі валюты.

«Дзеўкі ў возеры купаліся, іх чаканні апраўдаліся». Ужо вечарам 29 чэрвеня стала вядома, што Беларусь пераявіла чарговы транш па запазычанасці ў належным аб'ёме — 600 мільёнаў рублёў. Але гэтым разам ужо расійская кампанія казыча нервы беларускім спажыўцам. Узнаўленне паставак павінна было адбыцца ў 23 гадзіны 29 чэрвеня (у 00.00 па Маскве). Але — не здарылася. 30 ліпеня «пастаўкі электраэнергіі ў Беларусь не пачаліся», — сказала РИА «Новости» крыніца ў кампаніі, не ўдакладніўшы, аднак, чаму такое адбылося.

Могуць жа, калі захочуць! А казалі: "Валюты няма, валюты няма!"

Але ж трэба ўлічваць, што мы пакуль што разлічваемся толькі па запазычанасцях. Мы разлічыліся за сакавік і красавік. Застаўся май, і скончыўся чэрвень. Фактычна, нашая запазычанасць засталася на тым жа ўзроўні, як і была, — за два месяцы. Так што можна чакаць працягу гэтага серыялу.

Тым часам міністр эканомікі Беларусі Мікалай Снапкоў лічыць, што беларускім энергетыкам трэба зацягнуць паясы і шукаць альтэрнатыўныя крыніцы электрычнасці.

Што да далейшага імпарту электраэнергіі з Расіі, то, паводле слоў Снапкова, рашэнне нафіт гэтага ўрад будзе прымаць зыходзячы з эканамічнай мэтазгоднасці.

«У нас дастаткова магутнасцяў для забеспячэння ўнутраных патрэб электраэнергіяй», — сказаў ён. Пытанне аб імпарце, паводле слоў Снапкова, вырашаецца Міністэрствам энергетыкі. Калі цэны будуць прымальнымі, то пэўную колькасць электраэнергіі Беларусь можа імпартаваць, дадаў кіраўнік Мінэканомікі.

А беларускае вышэйшае кіраўніцтва нібыта не заўважае гэтых цяжкасцяў. Прэзідэнт Беларусі за некалькі гадзін да адключэння электраэнергіі бадзёра апладзіраваў на выпускном балі былых студэнтаў ВНУ. Зноў гучалі словы пра тое, што Беларуская вышэйшая школа славіцца высокім узроўнем падрыхтоўкі спецыялістаў і пасяхова развівае праверанныя часам традыцыі. Лукашэнка падкрэсліў, што беларускія дыпломы каціруюцца ва ўсім свеце, папулярнасць айчынных ВНУ за мяжой расце з кожным годам. «З багатым багажом набытых ведаў вы можаце рэалізаваць сябе ў розных сферах эканомікі, займацца навукай, творчасцю, адкрыць уласную справу. У Беларусі для гэтага магчымасці ёсць», — лічыць Лукашэнка.

Але гэтым разам у ягоных словах гучалі і панічныя ноткі. «Таму папрасіў бы вас як дарослых, паспяховых людзей не паддавацца ні на якія правакацыі і авантуры — а спакусаў у жыцці будзе дастаткова, — быць сапраўднымі патрыётамі, сумленнымі і адказнымі грамадзянамі сваёй краіны», — заявіў беларускі кіраўнік.

Відавочна, што зараз улады напужаныя ўласнымі грамадзянамі. Інтэрнэт-супольнасць «Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі» адзначае: «У нашых групах у сацыяльных сетках паступае ўсё больш паведамленняў пра тое, што кіраўнікам шэрагу дзяржаўных прадпрыемстваў «зверху» загадалі ўсімі магчымымі шляхамі засцерагчы сваіх работнікаў ад удзелу ў якіх-небудзь няўзгодненых з імі мерапрыемствах». Напрыклад, настаўніцу прымушаюць ісці на дыскатэку, дый пры гэтым абавязваюць забяспечыць яўку яшчэ 10 сваіх вучняў. У адным з універсітэтаў тамтэйшыя ідэолагі ўжо даручылі старастам раздаваць бясплатныя білеты на канцэрт беларускай эстрады. На некаторых заводах з'яўляюцца чуткі аб тым, што ў той час, як будзе праводзіцца «Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі», будуць праведзены свае акцыі, але ўжо ў падтрымку цяперашняй нязменнай улады.

Пра ўзровень панікі ва ўладзе можна ўявіць па абсурднасці заяваў сілавікоў. 3 ліпеня мінчане і госці сталіцы змогуць беспакарана апладзіраваць толькі ветэранам, удзельнікам парада і артыстам. Пра гэта заявіў на прэс-канферэнцыі 27 чэрвеня намеснік начальніка ГУУС Мінгарвыканкама — начальнік міліцыі грамадскай бяспекі Ігар Яўсееў.

Больш абсурдна атрымалася ў Гомелі. Суд Савецкага раёна Гомеля 27 чэрвеня прызнаў грамадскага актывіста Пятра Філона вінаватым ва ўчыненні адміністрацыйнага правапарушэння, прадугледжанага арт. 23.34 КоАП (парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавага мерапрыемства або пікетавання). Сутнасць правапарушэння заключалася ў запрашэнні, адрасаваным сябрам у сацыяльнай сетцы «ВКонтакте», сустрэцца 27 чэрвеня ў 19.00 каля помніка воінам-інтэрнацыяналістам у Гомелі. Суд угледзеў у гэтым парушэнне парадку арганізацыі масавага мерапрыемства і пакараў актывіста штрафам у памеры 3 базавых велічынь (105 тысяч рублёў).

Падкрэслім, не ў сераду, не на цэнтральнай плошчы горада, не з заклікам да ўдзелу ў нейкім мерапрыемстве, а проста сабрацца. Прыкладам, піўка папіць. Піўко выйшла задарагое…

У страха вочы вялікія.

> Міністр эканомікі Беларусі Мікалай Снапкоў лічыць, што беларускім энергетыкам трэба зацягнуць паясы і шукаць альтэрнатыўныя крыніцы электрычнасці

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### ІГАР ЯЎСЕЕЎ




Хіт тыдня — заява начальніка міліцыі грамадскай бяспекі Мінску Ігара Яўсеева: пляскаць у далоні 3 ліпеня на цэнтральных вуліцах сталіцы можна толькі на адрас ветэранаў. Такой эпатажнай мерай улады хочуць забараніць маўклівыя акцыяў пратэсту, што чатыры разы прайшлі ў Беларусі. Адна з такіх акцыі прызначаная на 3 ліпеня. Сілавікі нагадалі журналістам, што правапарушэннем з'яўляецца ўжо сам факт збору людзей на цэнтральных плошчах Мінска, незалежна ад мэты збору альбо фармату акцыі.

«Любыя імпрэзы, якія не санкцыянаваныя Мінгарвыканкамам, яны забароненыя на Кастрычніцкай плошчы, а таксама плошчы Перамогі і Леніна. Таму, натуральна, да парушальнікаў будуць прынятыя меры», — папярэдзіў аматараў масавых прагулянак Яўсееў. Які, да слова, быў заўважаны 19 снежня мінулага года за пачэснай працай па ахове парадку — збіццём фотажурналіста.

Адзначаць Дзень Незалежнасці 3 ліпеня пачнуць у пятніцу, 1 ліпеня, у Палацы Рэспублікі, а скончаць — каля стэлы «Горад-герой Мінск» у панядзелак, 4 ліпеня, а 2-й гадзіне ночы. Увесь гэты час уся міліцыя будзе працаваць у поўным складзе ва ўзмоцненым рэжыме.

### МІХАІЛ СІВАКОЎ



Капітан моладзевай зборнай Беларусі па футболе, якая выйграла пуцёўку на летнюю Алімпіяду 2012 года (зборная Беларусі выйграла ў каманды Чэхіі з лікам 1:0), у адным з постматчавых інтэрв'ю нагадаў пра заслугі свайго старэйшага калегі і сказаў, што гэтая перамога — і частка яго заслугі.

«Пасля паразаў спакойна рыхтаваліся да наступных матчаў. Імкнуліся дыстанцыявацца ад негатыву, не чытаць прэсу. Ніякай панікі не было. Мы заўсёды верылі ў тое, што зможам здабыць пуцёўку на Алімпіяду. Асабіста я пасля перамогі над Ісландыяй быў упэўнены, што мы выйдзем з групы. Так, без шанцавання не абышлося. Аднак шанцуе мацнейшым. Нядобразычліўцам, зайздроснікам нічога казаць не буду. Ёсць вынік, і ён важнейшы за шматлікія словы, — цытуе каментар Сівакова Goals.by. — Лічу, мы павінны адзначыць, што ў гэтым поспеху вялікая заслуга Юрыя Курненіна. Яго праца і па гэты дзень прыносіць плён. Думаю, мы павінны ўшанаваць яго памяць, пабываць на магіле».

Знакаміты футбаліст «Дынама» (Мінск), чэмпіён СССР 1982 года, Юрый Курненін быў галоўны трэнерам моладзевай зборнай Беларусі на папярэднім першынстве Еўропы. Тады зборная не выйшла з групы. Юрый Курненін моцна перажываў няўдачу і памёр праз месяц, 30 ліпеня 2009 года. Яму было 56 гадоў.

«Параза ад іспанцаў у паўфінале — самае цяжкое ў маёй кар'еры. Асабіста я вельмі доўга ад яго адыходзіў. Клаўся спаць, і перад сном у галаве пралятала гэтая атака на 89-й хвіліне, калі нам забілі гол і матч перайшоў у дадатковы час. Але нельга жыць учорашнім днём, трэба было настройвацца на гульню за бронзу з чэхамі. Пастараліся сканцэнтравацца і не вяртацца думкамі да паўфіналу», — падзяліўся найбольш цяжкім эпізодам сваёй кар'еры з журналістам сайту sports.ru Сівакоў.

### МІХАІЛ ЗАХАРАЎ



«Зоркай» п'янага ваджэння стаў трэнер хакейнага клубу «Юнацтва» і сябар Аляксандра Лукашэнкі Міхаіл Захараў. Раніцай 12 чэрвеня ў Мінску навюткі Bentley Continental GT урэзаўся ў Lexus LX570. Пасля сутыкнення Bentley загарэўся, і тушыць яго прымчалі ратавальнікі. «У нас столькі «Бэнтлі» і іншых машын трапляе ў здарэнні, — сказаў Аляксандр Лукашэнка ў час прэс-канферэнцыі. — А ўбачылі толькі з Захаравым чамусьці... які недзе круціцца каля прэзідэнта. І ўсё замерлі ў чаканні: "Як адрэагуе прэзідэнт?" Як да ўсіх. П'яны? Быў п'яны за рулём?.. Яму правялі экспертызу — 1,03 праміле. Я вам адкрываю сакрэт. Як толькі мне далажылі раніцай па гэтай падзеі — на ўсю катушку, як усім».

Міхаіл Захараў аварыю ніяк не каментаваў, а трубку яго мабільнага тэлефона пасля здарэння здымала дзяўчына Марына, якая запэўнівала: за рулём Bentley Continental GT была яна. Але правоў пазбавілі Захарава. Рашэнне асабіста прымаў начальнік ДАІ Цэнтральнага раёна. «Яго пазбавілі правоў на тры гады і далі максімальны штраф — 35 базавых велічынь (1,225 мільёна рублёў). Рашэнне аб пазбаўленні правоў было прынятае 16 чэрвеня, — цытуе «Комсомольская правда в Белоруссии» начальніка ДАІ Мінска Дзмітрыя Карзюка.

САЦЫЯЛОГІЯ

# ПАЖАР НА БАЛОЦЕ

## САЦЫЁЛАГІ ФІКСУЮЦЬ АБВАЛ ДАВЕРУ ДА ЎЛАДЫ

**Чэрвеньскае апытанне Незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў паказала абвал даверу да ўлады ў насельніцтва, рэзкае пагаршэнне дабрабыту беларусаў.**




Метадам face-to-face interview спецыялісты НІСЭПД апыталі ў чэрвені 1 503 рэспандэнты ва ўзросце ад 18 гадоў, памылка рэпрэзентатыўнасці не перавышае 3%.

Аналітыкі НІСЭПД найперш апелююць да эканамічнага складніку апытання — людзі канстатуюць сваё гранічнае збядненне.

У сакавіку гэтага года 26% рэспандэнтаў сказалі, што іх матэрыяльнае становішча за апошнія тры месяцы пагоршылася, у чэрвені гэтая лічба вырасла ў разы — 73,4% апытаных заявілі пра сваё збядненне. Цікава, што ў сакавіку мінулага года пасля 20% дэвальвацыі, якую ўлады тлумачылі следствам сусветнага фінансавага крызісу і патрабаваннем МВФ, такі адказ далі 29,8%. «Беларуская эканоміка знаходзіцца ў крызісе», — такое меркаванне выказалі 81,5% апытаных. І, насуперак таму, што гучыць з высокіх трыбунаў, пераважная большасць мяркуе, што ў гэтым вінаваты прэзідэнт (44,5%) і ўрад (36,7%).

«Не ўзровень галечы, а ўзровень падзення адносна ранейшага ладу жыцця ёсць вызначальным. У кожнага чалавека ў розны час ён свой, — разважае прадстаўнік партыі БНФ, адзін з арганізатараў і ўдзельнікаў масавых акцый пратэстаў у 1990-я гады Віктар Івашкевіч. — Напрыканцы 1980-х дэфіцыт тавараў справакаваў лакальныя страйкі, але яны не прымалі масавага характару. У другой палове 1990-га была сітуацыя, як зараз, — усе супраць. Як пажар на балоце — агню не бачна, але курыць. І вось у сакавіку 1991 года, калі ў два разы падвысілі цэны, людзі прыйшлі на абед у заводскай сталоўцы, а ім сказалі, што трэба плаціць два рублі, а не адзін. Скончылася крыкам і маршам да Дома ўрада». Ацэньваючы цяперашнія лакальныя сацыяльныя пратэсты, Віктар Івашкевіч як чалавек дасведчаны гаворыць: «Цяпер не трэба будзе чакаць наступнай восені».

«Рэальнае падзенне заробкаў «адправіць людзей да іх дырэктараў, а тыя, ужо ў сваю чаргу, скажуць, хто ў нас усім кіруе. Базавае тут — настрой. Мяжа жабрацтва, якую беларусы не прымаюць, ужо пяройдзеная. Тыя рабочыя, якія выйшлі нядаўна на страйкі, таксама не мелі з сабой сцягоў Пазняка, а прасілі заробкаў. Праўда, яшчэ ёсць надзеі, ёсць нармальнае жаданне адцягнуць рашучы крок. Хачу сказаць, што лідары грамадства з'яўляюцца па запатрабаванню, але для гэтага трэба быць побач з людзьмі», — папярэджвае сваіх паплечнікаў па палітычнаму полю Івашкевіч.

Колькасць тых, хто лічыць, што «ў цэлым сітуацыя ў Беларусі развіваецца ў няправільным кірунку», усяго за тры месяцы ўзрасла з 40% да 61,8%, а «ў правільным» — наадварот, знізілася з 45% да 26% (амаль дасягнуўшы самага нізкага паказчыка вясны 2003 года за ўсю гісторыю маніторынгу НІСЭПД).

### Манетарныя сімпатыі

Паколькі беларусы схільныя найперш да «каўбасных» бунтаў, а не да адстойвання Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, сацыёлагі выводзяць лагічны ланцужок — абвал эканомікі справакаваў расчараванне ва ўладзе.

Колькасць тых, каго «за апошнія тры гады крыўдзілі прадстаўнікі органаў улады», за паўгода вырасла на 4% і дасягнула 33,7%, а тых, «хто хутчэй не адчувае сябе абароненымі ад магчымага самавольства з боку ўладаў, міліцыі, ДАІ, падатковай службы, судоў, іншых дзяржаўных структур» павялічылася на 8% і дасягнула амаль 57%.

У сакавіцкім апытанні колькасць тых, хто лічыў, што «перамога Лукашэнкі на прэзідэнцкіх выбарах яшчэ больш з'яднала беларускае грамадства» перавышала колькасць тых, хто сказаў, што «яшчэ больш раскалола» (40,9% vs. 38,7%), то цяпер гэтыя суадносіны сталі адваротнымі — 31,05% vs. 44,9%.

Больш за палову (52,5%) апытаных мяркуюць, што прэзідэнт Лукашэнка перш за ўсё абапіраецца «на вайскоўцаў, МУС, КДБ», 37,9% — «на прэзідэнцкую» вертыкаль, 23,08% — на дзяржаўных чыноўнікаў. Простыя людзі (19,03%), спецыялісты ( 7,2%), культурная і навуковая эліта (4,1%), бізнэсмэны (2,5%) — аўтсайдэры па ўзроўню падтрымкі дзеючай улады ў свядомасці беларусаў.

Нягледзячы на агульны нізкі ўзровень паліталагічнай адукаванасці беларусаў, аўтарытарызм раптоўна перастаў карыстацца падтрымкай. На пытанне «Як Вы лічыце, тое, што ў руках А. Лукашэнкі сканцэнтравана цяпер практычна ўся ўлада ў краіне, ідзе на карысць Беларусі ці не дае краіне нічога добрага?» 59,1% адказалі «не дае краіне нічога добрага» і толькі 26% — «ідзе на карысць Беларусі» (у верасні мінулага года гэтыя суадносіны былі 38,5% vs. 44,1%).

Упершыню за многія гады лік тых, хто давярае прэзідэнту, нашмат перавысіў колькасць тых, хто давярае: 53,8% vs. 35,7% (яшчэ паўгода таму было 34,1% vs. 55%), а колькасць гатовых зноў прагаласаваць за яго на прэзідэнцкіх выбарах упершыню з сакавіка 2003 года апусцілася ніжэй за 30% і склала 29% (у снежні 2010 года — 53%, у сакавіку 2011 года — 42,9%).

Палітолаг, аўтар кнігі «Аляксандр Лукашэнка. Палітычны партрэт» Валерый Карбалевіч мяркуе, што ў падзенні рэйтынгу для беларускага лідара тоіцца сапраўдная небяспека. «Рэйтынг кіраўніка дзяржавы ва ўмовах персаналісцкага рэжыму асабліва важны. Адметнасць беларускага палітычнага рэжыму ў тым, што ідэалагічны канструкт афіцыйнай прапаганды трымаўся на аксіёме: «увесь народ падтрымлівае прэзідэнта, а апазіцыя — гэта кучка адмарозкаў, што жывуць за кошт заходніх грантаў». У гэтым канструкце кіраўнік дзяржавы мусіць атрымліваць на выбарах 80–75% галасоў. Усенародна абраны правадыр не можа мець менш за 30% падтрымкі, таму гэтая лічба — сапраўды моцны ўдар па іміджу Лукашэнкі і стваранай ім мадэлі. І нездарма ўлады спрабуюць фарсіраваць сітуацыю, а Лукашэнка на апошняй прэс-канферэнцыі цвердзіў, што крызісу ў нас няма», — зазначае палітолаг.

### Як кажуць у Адэсе, гэта — дзве вялікія розніцы

Чэрвеньскае апытанне пакуль не выявіла росту пратэстнага патэнцыялу ці, тым больш, «перспектыў беларускай рэвалюцыі». Да акцый пратэсту, якія прайшлі пасля прэзідэнцкіх выбараў 19 снежня 2010 года, ухвальна ставяцца 26% (асуджальна 43,7%, абыякава 24%), а колькасць тых, хто мяркуе, што людзі ў Беларусі ў той ці іншай ступені «баяцца выказваць свае палітычныя погляды» цяпер складае ўжо 85%.

Бачаць сябе «ў апазіцыі да цяперашняй улады» 25% (прычым 60% — «удзельнічалі ў публічных дзеяннях для выказвання свайго меркавання такіх, як мітынгі, дэманстрацыі, страйкі і інш.) выказалі гатоўнасць да такіх дзеянняў каля 20%). Валерый Карбалевіч падкрэслівае, што «больш важна не тое, колькі людзей адказваюць на пытанне сацыёлагаў, а важна, колькі насамрэч выходзіць». «Розніца ў адказе «так» і рэальных дзеяннях — на парадак! Цяжка сказаць, якая маса будзе крытычнай. Да таго ж пытанне не толькі ў тым, колькі людзей выйдзе на вуліцу ў адзін дзень і час, а і ў тым, колькі яны гатовыя там стаяць. 19 снежня, калі АМАП прыйшоў разганяць плошчу, па маіх ацэнках, трацiна людзей ужо самі сышлі. Цяжка гэта вымяраць у лічбах, але мяркую, што сто тысяч — тая маса, што магла б уплываць і на дзеянні наменклатуры, і на дзеянні сілавікоў», — выказвае свае ацэнкі эксперт.

### Ружжо на сцяне

Рэпрэсіўныя меры ўладаў супраць апанентаў усё больш выклікаюць нязгоду і раздражненне ў грамадстве: суровыя прысуды ўдзельнікам «масавых беспарадкаў 19 снежні 2010 года» амаль 40% апытаных ацэньваюць як несправядлівыя. Аднак страх перад беларускай «фемідай» пакрысе рассейваецца, і да пратэстаў далучаюцца, так бы мовіць, неафіты. Па краіне праходзяць масавыя «маўклівыя» пратэстныя гулянні. Як сведчыць апытанне НІСЭПД, такая мабілізацыя найперш тлумачыцца ростам папулярнасці сацыяльных сетак сярод беларусаў: сёння сеткай «Вконтакте» карыстаюцца 20%, «Аднакласнікі» — 17,9%, «Facebook» — 8,5%. Менавіта праз інтэрнэт арганізатары «маўклівых» пратэстаў і заклікаюць людзей выходзіць на вуліцу, а таксама збіраюць штрафы асуджаным за апладысменты на вуліцах сталіцы.

Палітолаг Андрэй Казакевіч да падобнай формы арганізацыі пратэсту ставіцца крыху скептычна, маўляў, палітычны вынік атрымліваецца з іншага рэцэпту. «Усё залежыць не толькі ад таго, колькі людзей прыйшло, але і ад таго, наколькі сур'ёзна яны настроеныя, якая арганізацыя вулічнай акцыі, бо для палітычнага выніку так ці інакш мусіць быць арганізатар. Хаця б для вядзення перамоў, калі гэта спатрэбіцца, — зазначае Казакевіч. — Плюс важна ўлічваць фактары задаволенасці ці незадаволенасці ўладамі бюракратычнага апарату, сілавых структураў. Толькі ў сукупнасці гэтых фактараў магчыма атрымаць перамены. Простай формулы ўвогуле не існуе. Маё адчуванне: каб нешта сапраўды адбылося, нам патрэбны час, бо ўплывовая наменклатурная, сілавая частка ўлады мае інертнасць. Крызіс у нас толькі пару месяцаў, калі ён зацягнецца і будзе пагражаць не толькі простым людзям, але і прадстаўнікам уладных структур, то можна чакаць, што змены ад масавых акцый будуць». Разам з тым палітолаг бачыць і пазітыў ад маўклівых акцый: «Людзі мабілізуюцца, самаарганізуюцца, ёсць палітычнае дзеянне, пераадольванне страху. Гэта пазітыўныя элементы для дэмакратычнай перспектывы. Але не думаю, што самі па сабе спантанныя акцыі могуць прывесці да палітычных рашэнняў. Нейкая структура, арганізацыя гэтага ўсяго мусіць быць. Хаця часам бывае, што падобныя хвалі падхопліваюць палітычныя структуры, але без падставовых арганізацыйных рэчаў гэтыя акцыі — толькі мабілізацыя, выплёскванне народнай энергіі».

### Здрада вялікаму брату

На «знешнепалітычным фронце» пакуль без пераменаў — беларусы робяць еўрапейскі выбар. Гатовых галасаваць на гіпатэтычным рэферэндуме за ўступленне Беларусі ў Еўрапейскі Саюз — 45%, «супраць» — 32%, на рэферэндуме аб аб'яднанні Беларусі і Расіі «за» — 31%, «супраць» — 48%. Калі б давялося паміж імі выбіраць, за ЕС прагаласавалі б 44,5%, за Расію — 35,3%. Выказванні кіраўніка Беларусі аб «такіх казлах, як Барозу» і пра «вашываць у цяперашняга кіраўніцтва Украіны» «рэзкай, але дапушчальнай ацэнкай некарэктных паводзінаў замежных партнёраў» назвалі толькі 21% рэспандэнтаў, а «недапушчальнай грубіянствам у адносінах да замежных партнёраў» — 68,6%.

**Падрыхтавала Вольга Хвоін**

АД РЭДАКТАРА

# КРЭДЫТЫ І САНКЦЫІ

Працяг.
Пачатак на стар. 1.



І калі, здавалася, заціхлі, схіліўшыся да адзнакі «не», Савет па замежных справах прыняў рашэнне «так». Уводзіцца эмбарга ў дачыненні да Беларусі на зброю і матэрыялы, якія могуць быць выкарыстаныя для рэпрэсій унутры краіны. Замарожваюцца актывы трох кампаній, звязаных з рэжымам. Распаўсюд дзейнасці Еўрапейскага інвестыцыйнага банка на Беларусь абумоўліваецца станоўчымі зменамі ў галіне правоў чалавека і вяршэнства закона. Дапамога з боку ЕС перанакіроўваецца ад беларускіх цэнтральных уладаў на падтрымку грамадзянскай супольнасці, у прыватнасці, рэпрэсаваным асобам, няўрадавым арганізацыям, СМІ ды студэнтам.

Зразумела, гэта пакуль што кропкавыя санкцыі, якія не закранаюць нафтаперапрацоўчага комплексу. Але ўпершыню ЕС увёў прамыя эканамічныя санкцыі супраць беларускіх кампаніяў. Але — ці не ўпершыню — яны адзін да аднаго супалі з раней уведзенымі санкцыямі ЗША. І ў першыню, па сутнасці аднан часова з рашэннем ЕС — 17 чэрвеня, Савет ААН па правах чалавека прыняў рэзалюцыю з асуджэннем дзеянняў уладаў Беларусі па дэстабілізацыі сітуацыі з правамі чалавека на працягу апошняга паўгода. Такім чынам, заходні фронт супраць таталітарнага беларускага рэжыму набывае пэўную маналітнасць, што яшчэ болей перакрывае магчымасці манеўра афіцыйнага Мінска.

Хаця відавочна, што поўнага адзінства сярод заходніх палітыкаў наконт мэтазгоднасці ўвядзення поўнамаштабных эканамічных санкцый яшчэ няма. Ёсць тыя, хто сумняваецца, ёсць і адкрытыя праціўнікі. Тым не менш гэтыя кропкавыя санкцыі з'яўляюцца выразным сігналам наконт верагоднасці іх пашырэння ў любы момант. Сігналам беларускай наменклатуры, атачэнню Лукашэнкі, што яны могуць страціць усё. Наменклатурны ж пераварот — найпершы жах любога аднаасобнага правадыра.

Увядзеннем санкцый Захад пераадолеў дзве свае асноўныя перасцярогі. Першую — што санкцыі могуць пагоршыць матэрыяльны стан насельніцтва. Насельніцтва ўжо ведае адказ на пытанне, хто вінаваты ў абвале, і адчувае, што лепш не будзе. Другую — што санкцыі адкінуць Беларусь цалкам пад уплыў Масквы.

Наадварот, санкцыі ёсць сігналам таксама Расіі, якая мае вялікую патрэбу ў развіцці добрых стасункаў і з Еўропай, і са Злучанымі Штатамі. Пашырэнне ж санкцый на нафтапрамысловы комплекс пазбавіць сэнсу яе пастаўкі нафты ў Беларусь, а значыць, звузіць да нельга і яе магчымасці ўплыву на Беларусь. Тым самым звужаюцца і магчымасці манеўра беларускага рэжыму на Усход.

Аналітыкі ўжо звярнулі ўвагу на тое, што ўпершыню эканамічныя ўмовы крэдыту Расіі адпавядаюць заходнім стандартам. Гэтак жа, як упершыню Расія асудзіла разгон плошчы і выказалася за вызваленне палітвязняў. Выпадковае супадзенне? Палітычная гульня з разлікам на замену дзеючага беларускага кіраўніка на больш лаяльную асобу? Змова Захаду і Расіі? Ці першыя прыкметы асэнсавання расійскімі палітычнымі гульцамі тэндэнцый сусветнага развіцця?

Паказальна, што санкцыі былі прынятыя ўжо пасля таго, як Беларусь звярнулася па крэдыт да Міжнароднага валютнага фонду, запрасіўшы ад 3,5 да 8 мільярдаў. Ці ўдасца гэты адчайны манеўр з працягнутай рукой А. Лукашэнкі? Ці хіснецца зноў Захад? У адказ пакуль што ветліва-бюракратычны халадок.

Што ж падштурхнула замежных палітыкаў да прыняцця санкцый? Падаецца, што найперш гэта вынік самога факту самадастатковасці дэмакратычных каштоўнасцей, якія сталіся арганічнай часткай заходніх палітычных сістэм, жыццятворным элементам грамадства. Парушэнне ж правоў чалавека ў Беларусі набыло такі маштаб і такія брутальныя формы, што не заўважаць іх, не рэагаваць на іх заходні палітык проста пазбаўлены магчымасці. Інакш апынецца перад пагрозай страціць давер сваіх выбарцаў.

МЕРКАВАННЕ

# БАЦЬКА, ДРОВЫ!

Канстанцін СКУРАТОВІЧ

**Беларускую эканамічную мадэль называюць па-рознаму. Прыкладам, нейкія нямецкія журналісты, запрошаныя на медыйны форум у Мінск, называюць гэта сацыялізмам. І даводзяць шараговым беларусам, што сацыялізм яшчэ не вычарпаў сваіх магчымасцяў.**

Магчыма. Але аўтар нямецкага «эканамічнага цуда» пачатку-сярэдзіны 1950-х гадоў Людвіг Эрхард, каб не ламаць сабе галаву і не тлуміць мазгі простаму люду, такія мадэлі адносіў да адміністрацыйна арганізаваных. Бо калі, прыкладам, аналізаваць «развіты сацыялізм», то без «руководящей роли КПСС» нічога і не патлумачыш. Але ж няма прынцыповай розніцы паміж палітбюро і, прыкладам, Міністэрствам развіцця эканомікі, якім у нацысцкай Германіі кіраваў Герынг. Толькі палітбюро складала пяцігадовыя планы, а Герынгу больш падабаліся чатырохгодкі.

А фараоны для такіх мэтаў, мусіць, карысталіся сонечнымі цыкламі.

Увогуле, эканоміка ў кожнай краіне і ў кожны час існуе дзякуючы дасягнутаму кампрамісу, не заўсёды выразна пазначанаму, паміж народам і правіцелямі. То бок эканамічныя стасункі заўсёды маюць канкрэтны характар. Прыкладам, Грэцыю апошнім часам параўноўваюць з Беларуссю. Магчыма, параўнанне слушнае, але аднабаковае. Нават у фармальным плане. За апошнія гады 10 мільёнаў грэкаў нахвасталі пазык на сотні мільярдаў еўра, а прыблізна такая ж колькасць беларусаў — усяго нейкіх 10–20 мільярдаў. Наконт Грэцыі шмат дэбатаў у Еўропе і ЗША, а сумы, якія прапануюцца для выратавання грэчаскай эканомікі, вымяраюцца сотнямі мільярдаў у еўрапейскай валюце. Пра Беларусь таксама многа гамоняць, а грошы даваць не спяшаюцца. Прыкладам, Расія, добра такі памучыўшы, пералічыла на мінскія рахункі ўсяго 800 мільёнаў долараў.

Кожны кіраўнік дзяржавы павінен мець знешнепалітычную стратэгію развіцця з выразным акцэнтам на нацыянальныя інтарэсы. У Лукашэнкі ж яе ніколі не было. Вось колькі год прайшло, а эксперты да гэтага часу спрачаюцца, чаго ён, уласна, хацеў для сябе і для краіны. І ўсё ж, чаго б ён ні хацеў, кампраміс паміж яго жаданнямі і ўяўленнямі насельніцтва пра тое, што добра і што дрэнна, існаваў. У межах так званага патэрналізму. Што б ні рабілася, але абы ціха. І асноўным прадметам гэтай выразнай дамоўленасці былі энерганосьбіты. Як тлумачылі маніпулятары грамадскай думкай, іх беларусы будуць мець колькі заўгодна і па лепшых коштах.

З гэтай нагоды на кожныя выбары апазіцыянеры ішлі з дрыжыкамі ў каленях. Бо трэба было адказаць на канкрэтнае пытанне, якое маглі задаць кожны жук і жаба: «Лукашэнка забяспечвае нас святлом і цяплом, а вы?..»

Зразумела, паліўнае пытанне вельмі важнае і для хатніх гаспадарак, і для эканомікі кожнай краіны. Але пры Лукашэнку яно набыло нейкую амаль містычную ўладу над людзьмі. Яны цалкам згубілі здольнасці разважаць, вызначаць для сябе іншыя, значна больш важныя жыццёвыя прыярытэты. І таму згубілі перспектыву, адчуванне часу з яго выключнымі, небывалымі для лёсу краіны магчымасцямі.

Ёсць такая даволі распаўсюджаная хвароба, якую можна назваць плоскім эканамізмам. Ёй хварэюць і простыя людзі, і тыя, хто лічыць сябе прасунутым. Пасля 1991 года дзясяткі краін набылі незалежнасць ці выйшлі з-пад апекі Крамля. І праблема народнагаспадарчага выжывання сталі перад усімі. У тым ліку і паліўная. І вырашалася яна па-рознаму, але ў прынцыпе паспяхова. Урады зачынялі энергаёмістыя і рэсурсаёмістыя прадпрыемствы, адначасова дазволілі бізнэсу ладзіць новыя, як у нас кажуць, навукаёмістыя вытворчасці. Дробязь, здаецца, але ў нас з большага гамоняць, а дзесьці робяць.

Людзі сталага веку памятаюць, што ў СССР не было лепшага аўтобуса за венгерскі «Ікарус». Як лічылі спецыялісты, з той нагоды, што тэхнічны стан савецкай прамысловасці не дазваляў наладзіць вытворчасць такіх плоскіх і кампактных рухавікоў, які стаяў на «Ікарусе». Але ж для Еўропы гэтых дасканаласцяў не хапіла. Венгры паспрабавалі прадаць аўтагігант — ніхто не купіў. Таму закрылі, каб не марнаваць рэсурсы. А людзі — хто пайшоў на пенсію, хто перавучыўся, хто ўладкаваўся на працу да замежных капіталістаў, якія прыйшлі ў краіну.



Увогуле, усе былыя прамысловыя гіганты, створаныя ва Усходняй Еўропе па схеме сталінскай індустрыялізацыі (прыярытэтнае развіццё вытворчасці сродкаў вытворчасці перад прадметамі спажывання), даўно зліквідаваныя. Прычым у Польшчы была вызначана такая дапамога з нагоды закрыцця нерэнтабельных вугальных шахт, каб шахцёру ніколі больш не захацелася лезці пад зямлю.

Чарговая нафтавая або газавая вайна з Расіяй заўсёды заканчвалася на карысць Лукашэнкі. Хоць апошняя перамога была атрымана досыць даўно, напачатку 2007 года. Але людзі верылі, што бацька, як у цягучым расійскім серыяле, вытрымае абяцанае.

Усё нагадвае дрэнны вадэвіль, у які нас уцягнулі, і на ролі ў масоўцы і публікі ў халоднай зале. Мусіць, таму бессмяротнае: «Бацька, грошы!» з «Вяселля ў Малінаўцы» трансфармуецца адпаведна з выклікамі часу ў больш слушнае — бацька, дровы!

Паверце на слова, я шчыры, у нечым падсвядомы патрыёт Беларусі, але не магу ўтрымацца ад рогату. А вось так нам і трэба.

Як паведамляюць, ААТ «Інтэр РАТ АЭС» з 29 чэрвеня цалкам прыпыніла пастаўкі электраэнергіі ў Беларусь, якая так і не здзейсніла чарговы плацеж у памеры 600 мільёнаў расійскіх рублёў для пагашэння запазычанасці.

Ні дроў, ні грошай — уключай дырэктыву №3, якая, па афіцыйных дадзеных, паспяхова выконваецца. Згодна Белстату, за 5 месяцаў энергаёмістасць ВУП на 8,9% пры плане — мінус 6–7%. Хутка ўвогуле без паліва абыдземся...

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# СІТУАЦЫЯ Ў БЕЛАРУСІ ЗАСТАЕЦЦА СКЛАДАНАЙ

Генадзь КЕСНЕР

**Вынікі паўгадавой дзейнасці ў Беларусі Міжнароднай назіральнай місіі, у якой працавалі і працуюць больш за 50 праваабаронцаў і грамадскіх актывістаў з Украіны, Арменіі, Расіі, Польшчы, Грузіі ды іншых краін, падсумавалі яе ўдзельнікі на прэс-канферэнцыі 28 чэрвеня ў офісе Беларускага Хельсінскага камітэта.**



Алег Гулак, Дзмітрый Макараў і Андрэй Юраў (на маніторы кампутара)

Адметнасцю гэтай прэс-канферэнцыі было тое, што адзін з яе ўдзельнікаў — кіраўнік Міжнароднай назіральнай місіі, дырэктар па развіццю Маскоўскай Хельсінскай групы Андрэй Юраў — адказваў на пытанні журналістаў праз інтэрнэт-відэа, бо вядомаму праваабаронцу беларускія ўлады забаранілі ўезд на тэрыторыю краіны. Пытанне, а як жа ж тут быць з дэклараванай саюзнай дзяржавай, дзе гарантуецца свабода перасоўвання грамадзян Беларусі і Расіі, можна пакінуць убаку. Дарэчы, з Беларусі ўжо былі дэпартаваны альбо не дапушчаны на яе тэрыторыю дзесяць замежных праваабаронцаў — сяброў місіі (сем расіян і тры грамадзяніна Украіны).

Сябра Каардынацыйнага савета міжнароднага Моладзевага праваабарончага руху Дзмітрый Макараў падкрэсліў, што міжнародныя назіральнікі місіі гэтыя паўгода пільна сачылі за сітуацыяй з выкананнем правоў чалавека ў нашай дзяржаве. «Ад самага пачатку асноўным фокусам у дзейнасці Міжнароднай назіральнай місіі былі якраз прафесійныя групы, якія падпадаюць пад найбольшы ціск у сітуацыі, што цяпер складваецца ў Беларусі, — праваабаронцы, журналісты і адвакаты — гэта значыць, тыя людзі, якія пры любых умовах, пры любых падзеях павінны мець магчымасць свабодна ажыццяўляць сваю прафесійную дзейнасць. Ні пры якіх умовах ціск на гэтыя прафесійныя групы не можа быць апраўданы», — падкрэсліў расійскі праваабаронца.

Андрэй Юраў паведаміў, што апошнім часам праваабаронцы місіі мелі кантакты з многімі буйнымі інвестарамі, у тым ліку і дзяржаўнымі, як на Захадзе, гэтак і на Усходзе. «Усе прызнаюць адну вельмі важную рэч: ніякія інвестыцыі ў Беларусь не будуць выгадныя, калі там не будуць ажыццёўлены тры базавыя прынцыпы, і першы сярод іх — гэта свабодная праца прэсы, як беларускай, так і міжнароднай. Любы інвестар цудоўна разумее, што ягоная выгада толькі ў абсалютнай празрыстасці… Яшчэ два прынцыпы — гэта незалежная судовая сістэма і свабода дзейнасці адвакатаў, а таксама свабоднае функцыянаванне ў Беларусі як айчынных, так і замежных грамадскіх арганізацый. Гэтае разуменне інвестарамі трыадзінства свабоднай дзейнасці прэсы, адвакатаў і грамадскіх актывістаў надае мне аптымізму», — адзначыў Андрэй Юраў.

«У Беларусі ёсць вельмі моцная і прафесійная грамадзянская супольнасць, якая здольная на многае, чаго няма, напрыклад, у такіх краінах, як Туркменістан, Узбекістан і цяпер ужо нават Казахстан. У гэтым сэнсе, параўноўваючы Беларусь з іншымі не вельмі свабоднымі і дэмакратычнымі дзяржавамі, Беларусь усё роўна выглядае, канешне, асобна. І многія лічаць, што надзеі на хуткія перамены да лепшага тут нашмат вышэйшыя».

Як адзначылі ўдзельнікі прэс-канферэнцыі, вялікую заклапочанасць выклікалі паводзіны беларускіх уладаў у дачыненні да мірных грамадзян, а таксама назіральнікаў і журналістаў не толькі 19 снежня 2010 года, але і 22 чэрвеня, падчас чарговай мірнай акцыі маўклівага пратэсту. «Празмернае і несувымернае выкарыстанне сілы ў дачыненні да грамадзян падчас мірных акцый з'яўляецца недапушчальным. І двойчы недапушчальным з'яўляецца тое, што адбываецца ў дачыненні да назіральнікаў і журналістаў. Гэта ёсць здзекам з міжнароднага права і, з майго пункту гледжання, пляўком на адрас АБСЕ, ААН ды іншых міжнародных структур», — заявіў Андрэй Юраў.

Як адзначыў Дзмітрый Макараў, Беларусь, на вялікі жаль, дэманструе адкрытую непавагу да сваіх міжнародных абавязкаў па ўсіх аспектах.

«Рэакцыяй на тыя рэкамендацыі, якія мы вылучаем па паляпшэнню сітуацыі, з'яўляецца эскалацыя ціску. Мы можам канстатаваць, што многія моманты, якія да гэтага ў беларускім заканадаўстве доўгі час не прымяняліся, зараз пачынаюць выкарыстоўвацца, — адзначае расійскі праваабаронца. — Можна ўзгадаць артыкул 193 прым. Крымінальнага кодэксу Беларусі (крымінальная адказнасць за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі) у дачыненні да праваабаронцы Алеся Бяляцкага, выносіцца другое папярэджанне БХК — адзінай зарэгістраванай у Беларусі праваабарончай арганізацыі, пастаянна пашыраецца спіс журналістаў і СМІ, якія падпадаюць пад ціск з боку ўладаў. А пазачарговая пераатэстацыя адвакатаў, на наш погляд, з'яўляецца вельмі сумнеўнай з пункту гледжання беларускага заканадаўства і зусім недапушчальнай з гледзішча міжнародных нормаў. Гэта азначае рост ціску на адвакатаў. Тут відавочна ганебнае, зняважлівае стаўленне ўладаў да тых дакументаў, якія Беларусь падпісвала, і да тых абавязкаў, якія яна на сябе ўзяла».

ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ

# ПАРТНЁРСТВА НЕ БЫЛО

Вольга ХВОІН

**1 ліпеня старшынства ў Еўрасаюзе пераходзіць ад Венгрыі да Польшчы. Пасол Венгрыі Ферэнц Контра, ацэньваючы дасягненні Венгрыі менавіта ў рэчышчы развіцця адносінаў ЕС і Беларусі, назваў апошні год «часам страчаных магчымасцяў».**



Ферэнц Контра



Жан-Эрык Хольцапфель



Лешак Шарэка

Пасол Ферэнц Контра заявіў, што падчас старшынства Венгрыі ў ЕС пасольства гэтай краіны ў Беларусі не змагло дасягнуць пазітыўных вынікаў. «У Беларусі мы не дабіліся поспеху. Апошні год яна дыстанцуецца ад Еўрасаюза. У выніку вядомых падзей 19 снежня самаізаляцыя краіны ўзрасла», — сказаў венгерскі дыпламат. Ён паведаміў, што спробы венгерскага пасольства дамовіцца аб дыялогу з вышэйшым кіраўніцтвам беларускага МЗС не мелі плёну. «Нам прапанавалі сустрэчы на ўзроўні намесніка начальніка аддзела, але гэты ўзровень недастатковы для такога кшталту перамоў. Я вельмі шкадую і зрабіў бы ўсё, каб адносіны паміж Беларуссю і ЕС умацаваліся, але партнёрства для гэтага не было», — рэзюмаваў спадар Контра.

Кіраўнік прадстаўніцтва Еўрасаюза ў Беларусі Жан-Эрык Хольцапфель з гэтай нагоды працытаваў вярхоўнага прадстаўніка па знешняй палітыцы і палітыцы бяспекі ЕС Кэтрын Эштан, што місія будзе ўмацоўваць адносіны з беларускім народам, што ЕС і надалей ва ўзаемаадносінах з Беларуссю будзе прытрымлівацца палітыкі крытычнага ўзаемадзеяння. Еўрасаюз патрабуе ад Беларусі вызвалення ўсіх палітзняволеных, павагі дэмакратыі, вяршэнства закона і правоў чалавека. Паглыбленне адносін паміж Еўрасаюзам і Беларуссю будзе залежаць ад выканання дзяржавай менавіта гэтых умоў.

Польшча ў перыяд свайго старшынства ў ЕС абрала некалькі стратэгічных ліній: гэта праца ў рэчышчы стварэння адзінага рынку, бяспека Еўропы і развіццё палітыкі суседства, пашырэнне Еўрасаюза.

«Мы будзем прасоўваць ідэю Усходняга партнёрства, ініцыятарамі якога з'яўляемся. Мы зацікаўленыя ў адносінах з Усходам, але ўплываць на палітыку ЕС у гэтым кірунку мы будзем незалежна ад нашага старшынства. Увогуле, старшынства ў Еўрасаюзе — гэта ўменне выказваць меркаванне Еўрасаюза цалкам, а не толькі краіны. Гэта экзамен сталасці дыпламатыі. Еўрасаюз — гэта больш, чым сума сепаратных інтарэсаў краін», — падкрэсліў пасол Польшчы ў Беларусі Лешак Шарэка.

Каментуючы эканамічныя санкцыі ЕС у адносінах да шэрагу беларускіх прадпрыемстваў, пасол Польшчы падкрэсліў, што гэта ўзгодненая пазіцыя краін-сябраў ЕС. «Тым самым быў дадзены вельмі ясны сігнал кіраўніцтву Беларусі, што палітыка, якая праводзіцца яе ўладамі, нам не падабаецца, што яе неабходна змяніць», — зазначыў дыпламат.

Спадар Ферэнц Контра задаўся рытарычнымі пытаннямі: «Хто ў Беларусі мае магчымасць некалькі месяцаў сачыць за дыпламатам? Здымаць яго днём і ноччу ў рэстаранах, кафэ? Хто мае рэсурсы паехаць за дыпламатам за мяжу і здымаць яго схаванай камерай? Хто можа праслухоўваць мабільныя тэлефоны? Каму гэта выгадна? Каму не спадабалася наша дзейнасць на пасадзе старшыні ЕС, на пасадзе старшыні Савета па правах чалавека?»

Пасол Венгрыі расказаў, што на вуліцы за дыпламатамі «невядомыя людзі ганяюцца з тэлекамерамі, для многіх з нас гэта пытанне бяспекі», а падчас сустрэч з прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці Беларусі пад пасольствам зноў з'яўляюцца невядомыя апаратары, хаця ніхто іх туды не клікаў.

Дыпламат нагадаў, што пасольства на працягу года прадстаўляла дзяржаву, якая старшынствавала ў Еўрасаюзе і выконвала функцыі прадстаўніка Савета ЕС па правах чалавека, і за гэты час пад ціскам з пасольства з'ехалі двое дыпламатаў. «У мяне быў памочнік, які прыехаў мінулым летам, а з'ехаў у кастрычніку, бо на яго быў ціск, з якім ён за 30 гадоў сваёй дыпламатычнай працы не сутыкаўся. Потым прыехаў новы саветнік, і ён таксама заўчасна з'ехаў з Беларусі з тых жа прычынаў», — падзяліўся ўмовамі працы дыпмісіі спадар Контра.

У чэрвені ў інтэрнэце з'явіўся відэаролік: як мяркуецца, на відэа была заснята размова жонкі венгерскага пасла ў Беларусі Іны Контра з нібыта палюбоўнікам у аэрапорце Італіі. Каментуючы гэты скандал, спадар Ферэнц Контра падкрэсліў, што не мае намеру падаваць з гэтай прычыны ў адстаўку. «Сваю сям'ю і сваю жонку я буду абараняць, чаго б гэта ні каштавала, — заявіў дыпламат. — Яна дарослы чалавек і мае права сустракацца з кім заўгодна, калі заўгодна».

Дыпламат падкрэсліў, што МЗС Венгрыі запатрабаваў неадкладна спыніць практыку ціску на прадстаўнікоў дыпмісіі, «інакш будуць наступствы». МЗС Еўрасаюза заняў аналагічную пазіцыю. Венгерскае дыпведамства заявіла, што згаданы інцыдэнт з'яўляецца грубай правакацыяй і вынікам працы спецслужбаў Беларусі.

# TV ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## 4 ЛІПЕНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 08.25, 11.50** «Дзелавое жыццё».
**08.30** Дак. серыял «Гараджане».
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**11.05** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**12.10** Народная камедыя «Каханне і галубы» (СССР).
**13.55** «Георгій Жукаў. Вайна і мір Маршала Перамогі». Дакументальны фільм.
**14.30** Nota Bene.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Здароўе».
**16.05** Патрабуецца.
**16.20** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**17.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.55** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.50, 01.30** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Відэафільм.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама».
**21.45** «Камандзіроўка».
**21.55** Кінараман «Уся каралеўская рацъ» (СССР, 1971). .
**00.35** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**11.55** «Дэтэктывы».
**12.30** «Жывая прырода: прамы рэпартаж».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Серафіма Цудоўная». Шматсерыйны фільм.
**22.10** Прэм'ера. Фільм «Атлантыда». Расія.
**23.05** «Мозг. Перазагрузка».
**00.05** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**00.55** Начныя навіны.

### ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Мiншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень».
**09.55** «Вялікі сняданак».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Вялікі горад».
**13.10** «Далёкія сваякі».
**13.50** Вялікі жывы канцэрт у Віцебску.
**15.40** «Фантастыка пад грыфам «Сакрэтна».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Мiншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Ціхае сямейнае жыццё». Расія, 2008.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Таямніцы свету з Ганнай Чапман».

### лад

**07.00** «ЛАДная раніца».
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.00** Дэтэктыў «Жураў» (Расія).
**10.00** Альбарутэнія.
**10.30** «Лабірынты. Гісторыя беларускага фотамастацтва». Частка 1-я.
**10.55** Жансавет.
**11.25** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**12.25** Прыгодніцкі фільм «Апошняе лета дзяцінства» («Беларусьфільм»). 2-я серыя.
**13.35** Мультсерыял «Іван і Мітрафан».
**13.50** Пра мастацтва.
**14.15** «Навіны надвор'я».
**14.45** Рэальны свет.
**15.15** «Гадзіна суду. Справы сямейныя».
**16.15** Медычныя таямніцы.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**17.00** Бітва экстрасэнсаў.
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Дэтэктыў «Жураў» (Расія).
**20.00** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Камедыя «У пятлі» (Вялікабрытанія).
**23.15** Бітва экстрасэнсаў.
**00.05** Рэальны свет.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Пакой смеху».
**10.20** «Ранішняя пошта».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**12.20** «Кулагін і партнёры».
**12.50** «Наша Феліцыта». Дак. фільм.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Манна нябесная».
**22.15** Тэлесерыял «Выкраданне багіні».
**23.10** Навіны - Беларусь.
**23.20** «Весткі.ru»..
**23.45** Прэм'ера. «Спякота. Хто ваюе з землянамі». Дакументальны фільм.

### НТВ

**07.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.30** «Праграма Максімум».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.05** Сёння.
**10.20** «Рускія сенсацыі».
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** Дэтэктыўны серыял «Муж і жонка».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.10** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Крымінальны серыял «Ліцейны».
**21.20** Серыял «Гадзіна Волкава».
**23.30** «Сумленны панядзелак».
**00.20** «У зоне адмысловай рызыкі».

### EUROSPORT

**09.30** Мотаспартыўны часопіс.
**09.45** Конны спорт. Скачкі. Агляд тыдня. Часопіс.
**10.15** Хакей на траве. Турнір Champions Trophy. Жанчыны. (Амстэрдам, Нідэрланды). Адборачны этап.
**11.15** Веславанне на байдарках і каноэ. Кубак свету. Слалам. Францыя.
**12.15, 20.15, 23.30** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Мексіка. 1/4 фіналу.
**13.45, 02.15** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Навіны.
**14.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс». Францыя. 2-і этап.
**14.55, 01.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс». Францыя. 3-і этап.
**18.45** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Бразілія - Нарвегія (Германія).
**20.10** Навіны.
**21.45** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**00.55** Навіны.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**07.35** «Час гонару», серыял: 36 серыя.
**08.25, 14.35** Чаму дэмакратыя? 5 серыя: «Абед з прэзідэнтам».
**09.15** Прыватная калекцыя.
**09.40, 15.25** На колах.
**10.10** Без рэтушы: «Права на смерць», рэпартаж, 2009 г., Беларусь.
**10.30** «89 міліметраў», дак. фільм, 2004 г., Германія–Беларусь.
**11.50** Вагон.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** Фільматэка майстроў: «Завадатар», маст. фільм, 1977 г., Польшча.
**13.50** «Час гонару», серыял: 36 серыя.
**15.55** Без рэтушы: «Права на смерць», рэпартаж, 2009 г., Беларусь.
**16.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**16.30** Эксперт.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 17 серыя.
**17.30** «Час гонару», серыял: 36 серыя.
**18.15** Чаму дэмакратыя? 5 серыя: «Абед з прэзідэнтам».
**19.10** Побач з намі.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Беларусы ў Польшчы.
**20.00** Еўропа сёння.
**20.30** Эксперт.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Героі не нашага часу: Рамуальд Жолтак: у цісках часу.
**21.40** Фільматэка майстроў: «Завадатар», маст. фільм, 1977 г., Польшча.
**23.25** Аб'ектыў.

## 5 ЛІПЕНЯ, АЎТОРАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.20** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** Відэафільм.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.40** «Камандзіроўка».
**12.10** Прыгодніцкая кінааповесць «Тая, што бяжыць па хвалях» (Расія).
**14.30** Патрабуецца.
**14.45** «Ведай нашых».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Школа доктара Камароўскага».
**16.05** Камедыйны серыял «Прыгоды салдата Івана Чонкіна» (Расія). 1-я серыя.
**16.55** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.50, 00.20** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Сфера інтэрасаў».
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.45** Меладрама «Тры колеры: Белы» (Францыя-Польшча- Швейцарыя).
**23.35** «Доктар Хаўс-5». Серыял (ЗША).
**00.25** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 19.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**11.55** «Дэтэктывы».
**12.30** «Жывая прырода: прамы рэпартаж».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Зачараваны ўчастак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Серафіма Цудоўная». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**22.10** Прэм'ера. Фільм «Атлантыда». Расія.
**23.05** «Несакрэтныя матэрыялы».
**23.35** «Сведкі».
**00.35** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.25** Начныя навіны.

### ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Мiншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Далёкія сваякі».
**08.40** Фільм «Ціхае сямейнае жыццё». Расія, 2008 г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** Фільм «Гарбаты». Францыя - Італія.
**15.40** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Мiншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Заложнік». Расія, 2005г.
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Забойчая сіла 3». Серыял.
**23.55** «Меч». Серыял.

### лад

**07.00** «ЛАДная раніца».
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**08.55** Дэтэктыў «Жураў» (Расія).
**09.55** Альбарутэнія.
**10.25** «Лабірынты. Гісторыя беларускага фотамастацтва». Частка 2-я.
**10.50** Жансавет.
**11.20** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**12.25** Прыгодніцкі фільм «Апошняе лета дзяцінства». 3-я серыя, заключная.
**13.30** Мультсерыял «Іван і Мітрафан» (Расія). 2-я і 3-я серыі.
**14.00** «Дарога да хаты». Дак. фільм.
**14.30** Рэальны свет.
**14.55** Халі-Галі. Скетч-шоў.
**15.10** «Гадзіна суду. Справы сямейныя».
**16.10** Медычныя таямніцы.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**17.00** Бітва экстрасэнсаў.
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Дэтэктыў «Жураў» (Расія).
**20.00** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Меладрама «Спатканне ўсляпую».
**23.10** Бітва экстрасэнсаў.
**00.00** Спорт-кадр.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Павуцінне. Гандлёвая мафія». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Манна нябесная».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Манна нябесная».
**22.15** Тэлесерыял «Выкраданне багіні».
**23.10** Навіны - Беларусь.
**23.20** «Весткі.ru».
**23.45** «Дзе золата «Чорнага прынца»?». Дакументальны фільм.

### НТВ

**07.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Кулінарны паядынак».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.05** Сёння.
**10.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**11.05** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** Дэтэктыўны серыял «Муж і жонка».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.10** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Крымінальны серыял «Ліцейны».
**21.20** Серыял «Гадзіна Волкава».
**23.30** «Алтар Перамогі. Дзяржаўная мяжа».
**00.20** «Адзін дзень. Новая версія».

### EUROSPORT

**09.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс». Францыя. 3-і этап.
**10.30, 12.00, 18.30** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Мексіка. 1/4 фіналу.
**13.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс». Францыя. 3-і этап.
**14.55** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс». Францыя. 4-ы этап.
**19.00, 23.45, 02.15** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Навіны.
**19.15** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Англія - Японія (Германія).
**21.10** Навіны.
**21.15** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Бразілія - Нарвегія (Германія).
**21.45** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Францыя - Германія (Германія).
**00.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс». Францыя. 4-ы этап.
**01.15** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.
**01.40** Навіны.
**01.45** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Будапешт (Венгрыя). Агляд.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Побач з намі.
**07.40** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 17 серыя.
**08.05** Фільматэка майстроў: «Завадатар», маст. фільм, 1977 г., Польшча.
**09.55** Еўропа сёння.
**10.20** Героі не нашага часу: Рамуальд Жолтак: у цісках часу.
**10.40** «Ранча», серыял: 16 серыя.
**11.30** Эксперт.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** Чаму дэмакратыя? 5 серыя: «Абед з прэзідэнтам».
**12.55** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 17 серыя.
**13.25** «У Бога за пазухай», камедыя, 1998 г., Польшча.
**15.00** Героі не нашага часу: Рамуальд Жолтак: у цісках часу.
**15.20** Еўропа сёння.
**15.45** Побач з намі.
**16.05** Беларусы ў Польшчы.
**16.20** «Бульбаны», мультсерыял.
**16.25** «Жылі дзядуля і бабуля», дак. фільм, 2007 г., Літва.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 18 серыя.
**17.30** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 44 серыя.
**18.30** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «З выцягнутымі рукамі», дак. фільм, ч. 1, 2006 г., Польшча.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**20.15** Праект «Будучыня».
**20.40** YoLife!
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Паляванне на дзівосы (спазнаваўчая праграма).
**21.40** «Код прысутнасці», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**22.15** «Дэтэрмінатар», серыял: 1 серыя.
**23.00** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 6 ЛІПЕНЯ, СЕРАДА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.35** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Сфера інтэрасаў». Эканамічная праграма.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.40** Відэафільм АТН «Веткаўская старавеpы» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Меладрама «Тры колеры: Белы» (Францыя-Польшча- Швейцарыя).
**13.45** «Радзівілы Нясвіжа». Дак. фільм.
**14.15** Сінематэка.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Школа доктара Камароўскага».
**16.05** Камедыйны серыял «Прыгоды салдата Івана Чонкіна» (Расія). 2-я серыя.
**17.00** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.55** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.50, 00.35** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**21.55** Камедыйная меладрама «Разумнікі».
**23.50** «Доктар Хаўс-5». Серыял (ЗША).
**00.40** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**11.55** «Дэтэктывы».
**12.30** «Жывая прырода: прамы рэпартаж».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Зачараваны ўчастак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. Шматсерыйны фільм «Хірамант. Лініі лёсаў».
**22.10** Прэм'ера. Фільм «Атлантыда». Расія.
**23.05** Асяроддзе пасялення.
**00.05** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**00.55** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Далёкія сваякі».
**09.00** Фільм «Заложнік». Расія, 2005г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Фірмовая гісторыя». Серыял.
**14.40** «Забойная сіла 3». Серыял.
**15.40** «Next 3». Серыял.
**16.50** «Гаворыць і паказвае Мінск».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Кітайская бабуля». Расія.
**22.05** «Дабро пажаліцца».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Забойная сіла 3». Серыял.
**23.55** «Меч». Серыял.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**08.55** Дэтэктыў «Жураў» (Расія).
**09.55** Альбарутэнія.
**10.25** «Лабірынты. Гісторыя беларускага фотамастацтва». Частка 3-я.
**10.55** Жансавет.
**11.25** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**12.25** Мультсерыял «Іван і Мітрафан».
**12.55** Камедыя «Купальская ноч».
**14.15** Спорт-кадр.
**14.40** Рэальны свет.
**15.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.10** Медычныя таямніцы.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**17.00** Бітва экстрасэнсаў.
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Дэтэктыў «Жураў» (Расія).
**20.00** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** «Спортлато 5 з 36».
**21.25** КЕНО.
**21.30** Трылер «Драпежныя воды».
**23.05** Бітва экстрасэнсаў.
**23.55** Рэальны свет.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Уладар свету. Нікола Цесла». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Манна нябесная».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Манна нябесная».
**22.15** Тэлесерыял «Выкраданне багіні».
**23.10** Навіны - Беларусь.
**23.20** «Весткі.ru».
**23.45** «Курортны раман з уладай». Дакументальны фільм.

### НТВ

**07.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.30** «Кватэрнае пытанне».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**10.20** «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** Дэтэктыўны серыял «Муж і жонка».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.10** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Крымінальны серыял «Ліцейны».
**21.20** Серыял «Гадзіна Волкава».
**23.05** Сёння.
**23.30** «Алтар Перамогі. Блакада».
**00.20** «Адзін дзень. Новая версія».

### EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.
**10.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету сярод студэнтаў (Кітай).
**13.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс». Францыя. 4-ы этап.
**14.25** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс». Францыя. 5-ы этап.
**18.45, 23.45, 01.45** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Навіны.
**19.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Экватарыяльная Гвінея - Бразілія (Германія).
**20.55** Навіны.
**21.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Францыя - Германія (Германія).
**21.45** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Групавы этап. Швецыя - ЗША (Германія).
**00.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс». Францыя. 5-ы этап.
**01.15** Навіны.
**01.20** «Алімпійская гульні». Алімпійскі часопіс.
**02.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 18 серыя.
**07.50** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 44 серыя.
**08.45** Сальда (эканамічная праграма).
**09.05** Праект «Будучыня».
**09.35** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «З выцягнутымі рукамі», дак. фільм, ч. 1, 2006 г., Польшча.
**10.35** «Ранча», серыял: 17 серыя.
**11.25** Невядомая Беларусь: «Код прысутнасці», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** Прыватная калекцыя.
**12.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**12.55** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 18 серыя.
**13.25** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 44 серыя.
**14.20** Праект «Будучыня».
**14.50** Паляванне на дзівосы.
**15.10** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «З выцягнутымі рукамі», дак. фільм, ч. 1, 2006 г., Польшча.
**16.10** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 18 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 19 серыя.
**17.30** «Дэтэрмінатар», серыял: 1 серыя.
**18.15** «Дзеці ў выгнанні. Успаміны», дак. фільм, 2007 г., Расія.
**19.10** Сальда (эканамічная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Хто ёсць кім?: «Людміла Гразнова».
**20.00** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»).
**20.25** Басанож па свеце.
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Побач з намі.
**21.40** Вагон.
**21.45** «Quo Vadis», тэлесерыял: 2 серыя.
**22.35** «Euromaxx».
**23.00** Аб'ектыў.

## 7 ЛІПЕНЯ, ЧАЦВЕР

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.45** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 08.20, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.25** Зямельнае пытанне.
**08.50** Слова Мітрапаліта Філарэта.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** Камедыйная меладрама «Разумнікі».
**13.45** Патрабуецца.
**14.00** Шэф-кухар.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Школа доктара Камароўскага».
**16.05** Камедыйны серыял «Прыгоды салдата Івана Чонкіна» (Расія). 3-я серыя.
**17.00** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.55** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.50, 00.45** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** «Купалле над Дняпром». Гала-канцэрт.
**23.55** «Доктар Хаўс-5». Серыял (ЗША).
**00.55** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**11.55** «Дэтэктывы».
**12.30** «Жывая прырода: прамы рэпартаж».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Зачараваны ўчастак». Шматсерыйны фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Фільм «Хірамант. Лініі лёсаў».
**22.10** Прэм'ера. Фільм «Атлантыда». Расія.
**23.05** Тэорыя невераг0днасці.
**23.50** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**00.40** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Дабро пажаліцца».
**08.50** «Далёкія сваякі».
**09.00** Фільм «Кітайская бабуля». Расія.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Фірмовая гісторыя». Серыял.
**14.40** «Забойная сіла 3». Серыял.
**15.40** «Next 3». Серыял.
**16.50** «Мінск і мінчане».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** Футбол. 1-ы кваліфікацыйны раўнд Лігі Еўропы. ФК «Мінск» - ФК «Алімпік» (Баку). Прамая трансляцыя. У перапынку «СТБ-спорт».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Забойная сіла 3». Серыял.
**23.55** «Меч». Серыял.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**08.55** Дэтэктыў «Жураў» (Расія).
**09.55** Альбарутэнія.
**10.25** «Лабірынты. Гісторыя беларускага фотамастацтва». Частка 4-я.
**10.55** Жансавет.
**11.05** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**12.30** Прыгодніцкі фільм «Па сакрэце ўсяму свету» («Беларусьфільм»). 1-я серыя.
**13.35** Мультсерыял «Іван і Мітрафан» (Расія). 6-я і 7-я серыі.
**14.05** «Зоркі.by». Дак. фільм (НГТРК).
**14.35** «Рэальны свет».
**15.00** Халі-Галі. Скетч-шоў.
**15.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.10** Медычныя таямніцы.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**17.00** Бітва экстрасэнсаў.
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Дэтэктыў «Жураў» (Расія).
**20.00** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Камедыя «Паўтара рыцары: У пошуках чароўнай Херцэлінды» (Германія).
**23.25** «Час футболу».
**23.55** Бітва экстрасэнсаў.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан. Нараджэнне легенды». Дак. фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Манна нябесная».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Манна нябесная».
**22.15** Тэлесерыял «Выкраданне багіні».
**23.10** Навіны - Беларусь.
**23.20** «Весткі.ru».
**23.45** Прэм'ера. «Ода да радасці». Дакументальны фільм.

### НТВ

**07.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Дачны адказ».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Следства вялі…».
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** Дэтэктыўны серыял «Муж і жонка».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.10** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Крымінальны серыял «Ліцейны».
**21.20** Серыял «Гадзіна Волкава».
**23.05** Сёння.
**23.30** Прэм'ера. «Знішчальнікі люфтвафэ. Усходні фронт».
**00.20** «Адзін дзень. Новая версія».

### EUROSPORT

**09.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс». Францыя. 5-ы этап.
**10.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету сярод студэнтаў (Кітай).
**13.45** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Навіны.
**14.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс». Францыя. 5-ы этап.
**15.15** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс». Францыя. 6-ы этап.
**18.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету сярод студэнтаў (Кітай).
**20.55** Навіны.
**21.05** Снукер. Турнір Wuxi Classic. Кітай. Дзень 2-і.
**23.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Мексіка. 1/2 фіналу.
**00.55** Навіны.
**01.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс». Францыя. 6-ы этап.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 19 серыя.
**07.45** «Дэтэрмінатар», серыял: 1 серыя.
**08.30** Сальда (эканамічная праграма).
**08.45** Побач з намі.
**09.05** На колах.
**09.30** Хто ёсць кім?: «Станіслаў Багданкевіч».
**09.45** «Дзеці ў выгнанні. Успаміны», дак. фільм, 2007 г., Расія.
**10.40** «Ранча», серыял: 18 серыя.
**11.30** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 18 серыя.
**12.50** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 19 серыя.
**13.15** «Дэтэрмінатар», серыял: 1 серыя.
**14.00** Побач з намі.
**14.20** На колах.
**14.45** Басанож па свеце.
**15.15** Хто ёсць кім?: «Людміла Гразнова».
**15.30** «Дзеці ў выгнанні. Успаміны», дак. фільм, 2007 г., Расія.
**16.30** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Чароўнае дрэва», серыял: 5 серыя.
**17.30** «Quo Vadis», тэлесерыял: 2 серыя.
**18.20** «Падзенне жалезнай заслоны», дак. фільм, 2009 г., Германія: 4 серыя, «Літва».
**19.15** YoLife!
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Навігатар.
**20.00** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** Два на два (тэледыскусія): Юрый Хашчавацкі і Яраслаў Раманчук.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Над Нёманам» (тэлечасопіс).
**21.40** «Пуаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 13 серыя.
**22.30** Рэпартэр.
**23.00** МакраФон: «Рок-карона: запісы 1997–1999 гг.»: ч. 1.
**23.30** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 10 ЛІПЕНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**1**

**06.50** Прыгодніцкая камедыя "Як я быў вундэркіндам". 1-я і 2-я серыі.
**09.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** Адмысловы рэпартаж АТН «Смяротная гонка».
**09.50** Фартыфікацыя.
**10.35** «Славянскі базар у Віцебску-2011». Дзённік.
**10.45** «Ведай нашых».
**10.55** Меладрама «Спроба Веры» (Расія). 2-я серыя.
**12.15** Лірычная камедыя «Верныя сябры». «(СССР).
**14.00** Дакументальны фільм «Кірмашовае стагоддзе» (НГТРК).
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Дак. цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**16.25** Фантастычная камедыя «Таўстун Альберт» (ЗША).
**18.05** Суперлато.
**19.15** Меладрама «А я кахаю жанатага» (Расія-Украіна).
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.50** «Славянскі базар у Віцебску-2011». Дзённік.
**22.00** «Славянскі базар у Віцебску-2011».

**НТ**

**07.00** «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь (з субтытрамі).
**09.20** Серыял «Мая выдатная няня».
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.15** «Фазэнда».
**11.50** «Настаўніцкі сабака». Анімацыйны фільм.
**13.05** Фільм «Маладая жонка».
**15.00** Прэм'ера. «Вянок бясшлюбнасці».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Нядзельны «Ералаш».
**16.40** «КВЗ». Прэм'ер-ліга.
**18.10** Фільм «Пры загадкавых абставінах».
**20.00** Контуры.
**21.05** Фільм «Накдаўн».
**23.35** «Yesterday live».
**00.30** «Ні хвіліны супакою…». Канцэрт.

**СТВ**

**07.15** «Я-вандроўца».
**07.40** Фільм «Паненка-сялянка». Расія.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**13.25** «Добры дзень, доктар!».
**14.00** Фільм «Таямніца чорных драздоў». СССР, 1983 г.
**15.40** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** Прэм'ера! «Геніяльны шпік».
**17.45** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Прыдуркі». Францыя, 1995 г.
**22.15** «Прафесійны бокс».
**23.30** Фільм «Страсны бульвар». Расія.

**ЛАД**

**07.20** Джэймс Бонд - Агент 007. Баявік (Вялікабрытанія-ЗША).
**09.15** «Правы чалавека». Аўтарская праграма.
**09.30** Мір вашай хаце.
**09.40** Меладрама «Дзяўчына ў парку» (ЗША).
**11.35** «Халі-Галі». Скетч-шоў.
**11.45** Тэлебарометр.
**11.50** Нашы тэсты.
**12.25** Рэальны свет.
**12.55** Серыял «Дурнушка Бэці-3» (ЗША).
**13.45** «Страсці па культуры».
**14.25** «Магія раялю». Музычны форум.
**15.25** Серыял «Маргоша». 5-8-я серыі.
**19.00** Джэймс Бонд - Агент 007. Баявік (Вялікабрытанія-ЗША).
**21.00** «Спортлато 5 з 36».
**21.05** КЕНО.
**21.10** «Навіны надвор'я».
**21.35** Моладзевая камедыя «Дачка майго боса» (ЗША).
**23.05** Культасвет.

**РОССИЯ**

**07.00** «Уся Расія».
**07.15** Мультфільмы.
**07.35** Фільм «Маналог».
**09.20** Фільм «Закаханы і бяззбройны». 2010 г.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** «З новай хатай!».
**12.35** Фільм «Ідзі і не аглядайся».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.50** «Рамантыка рамансa».
**15.50** «Хлопцы з нашага «Гарадка». Дакументальны фільм.
**16.50** Музычны фільм «Трэмбіта».
**18.30** «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Прэм'ера. Фільм «Люблю 9 сакавіка!». 2010 г.
**22.40** Фільм «Пачуй маё сэрца». 2010 г.

**НТВ**

**07.40** Дзіцячая раніца на НТБ-Беларусь.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Крамлёўскія дзеці».
**11.10** «Баль на ўвесь свет».
**12.00** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.
**14.10** Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
**15.40** «Развод па-руску».
**16.30** «Следства вялі…».
**17.20** «І зноў добры дзень!».
**18.10** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «УГРО».
**19.00** Сёння.
**19.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «УГРО».
**20.15** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**22.30** «Нтвшнікі».
**23.25** «Гульня».
**00.20** «Пакаранне.Руская турма ўчора і сёння».

**EUROSPORT**

**09.30** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Навіны.
**09.45** Вось дык так!!!
**10.00** Аўтаспорт. Серыя ГП 3. (Сільверстоўн, Вялікабрытанія). Гонка 1-я.
**10.30** Аўтаспорт. Серыя ГП 3. (Сільверстоўн, Вялікабрытанія). Гонка 2-я.
**11.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс». Францыя. 8-ы этап.
**11.30** Веславанне. Кубак свету (Люцэрн, Швейцарыя).
**12.45** Супербайк. Чэмпіянат свету. (Брно, Чэхія).
**13.00** Супербайк. Чэмпіянат свету. (Брно, Чэхія). Заезд 1-ы.
**14.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны (Германія). 1/4 фіналу.
**15.55** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс». Францыя. 9-ы этап.
**18.45** Футбол. Кубак свету. Жанчыны (Германія). 1/4 фіналу.
**20.30** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Навіны.
**20.45** Пляжны футбол. Еўраліга. Германія - Чэхія (Берлін, Германія).
**21.45** Матаспартыўны часопіс.
**22.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету сярод студэнтаў (Кітай).
**23.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Мексіка. Матч за 3-е месца.
**01.00** Ралі рэйд. «Шаўковы шлях». Дзень 1-ы.
**01.15** Супербайк. Чэмпіянат свету. (Брно, Чэхія). Заезд 2-і.
**02.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Мексіка. Фінал.

**БЕЛСАТ tv / BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.15** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 19 серыя.
**08.00** Калыханка для самых маленькіх.
**08.30** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**08.55** Еўропа сёння.
**09.25** «Афіцэры», дэтэктыўны серыял: 6 серыя.
**10.10** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**10.35** Беларускія лёсы: «Саматра», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**11.05** Госць «Белсату».
**11.25** «Рай Олі Гопнудла», маст. фільм, 1989 г., ЗША.
**12.55** «Дзе цяпер той мур?», дак. фільм, 2009 г., Германія.
**13.45** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**14.10** «Рэвалюцыя», дак. фільм, 2007 г., Францыя: 5 серыя, «Міша і «Рэвалюцыя ружаў».
**15.05** «Герой года», маст. фільм, 1986 г., Польшча.
**17.00** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**17.25** «Час гонару», серыял: 37 серыя.
**18.10** Чаму дэмакратыя? 6 серыя: «За Бога, цара і Айчыну».
**19.05** Басаног па свеце (спазнаваўчая праграма).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Англійская для дзяцей.
**19.45** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.50** На колах.
**20.20** Вагон.
**20.25** Без рэтушы: «Рок назаўжды», дак. фільм.
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Эксперт.
**21.55** Фільматэка майстроў: «Проста неверагодна!», маст. фільм, 2001 г., Францыя.
**23.40** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.45** Тыдзень у «Аб'ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца магчыма на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ААО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый;
Мінск: (8 029) 178 31 68, Вольга;
Бабруйск: (8029) 628 75 01, Вольга

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ____________
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ____________

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ____________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Паважаныя чытачы!

Падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Пеня ______

Кассир Всего ______

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

ПАДЗЕЯ

# САЎКА І ГРЫШКА АДСВЯТКАВАЛІ ГОД СУПОЛЬНАЙ ТВОРЧАСЦІ

Ева ВАЙТОЎСКАЯ

**Халодны чэрвень 2011 года выдаўся гарачым на падзеі культуры. Дала сябе ведаць не толькі адсутнасць спёкі, якая ў іншыя гады фактычна выганяе гарадскіх жыхароў на курорты і лецішчы. Шакуючыя падзеі снежня 2010 года, а пасля красавіцкі выбух у метро сур'ёзна скаланулі прадстаўнікоў культуры, ператварыўшы мінулую зіму і вясну ў фактычна мёртвы сезон. І таму дзеячы культуры спрабуюць данесці да народу ўсё тое, што не паспелі прачытаць, праспяваць і прамаляваць увясной.**



Фота Зоі Сазонавай

«Напачатку большую сімпатыю ў мяне выклікаў гэты адмоўны персанаж, Саўка. Дробны наменклатуршчык, бо ён такі больш душэўны, адкрыты да дыялогу. Хоць ясна, што ў яго памылковыя перакананні, ён можа быць такім дурнаватым, і ў той жа час — сімпатычным. А другі, Грышка, наадварот, выклікаў антыпатыю, таму што ён такі зашораны апазіцыянер з КХП-БНФ, усё яму не падабаецца. Некаторы час было так, але пасля пэўных падзеяў яны змяніліся. Апазіцыянер Грышка набыў столькі цікавых рысаў характару! А дробны наменклатуршчык Саўка нядаўна здаў свайго сябра ў мянтоўку...»
**Лявон Вольскі для «Радыё Свабода»**

28 чэрвеня ў Мінску адбылася прэзентацыя вострасюжэтнага музычнага праекту «Саўка ды Грышка. Песні праўды». Гэтыя песенькі многія слухалі штотыдня на сайце «Радыё Свабода». Ідэя раздваення беларускага народу на «чэсных» і «шчырых» была ўвасобленая ў аля рэстаранных прыпеўках на папулярныя матывы. Фальклорныя Саўка ды Грышка, якія калісь «ладзілі дуду», цяпер — па розныя бакі беларускіх барыкадаў. Саўка — дробны лукашэнкаўскі чыноўнік, а Грышка — спачувае апазіцыі. Дзень пры дні абодва спявалі голасам Вольскага (у розных танальнасцях, апрабаваных ім яшчэ пры стварэнні знакамітых Казіка і Юзіка з «Народнага альбому») аб «бягучай палітычнай сітуацыі». Праект меў сваю дынаміку. Ці думаў, напрыклад, Вольскі, што абодва героі трапяць у беларускую турму пасля 19 снежня?.. Толькі Саўку забяруць памылкова ды хутка выпусцяць, а вось «Грыша із цюрмы яшчэ ня выйшаў».

Нягледзячы на заяўленую нагоду канцэрту, 28 чэрвеня ў Мінскім Loft-cafe Вольскі і яго музыкі не сталі засяроджвацца на самім праекце, а проста праспявалі ўсе абажаныя публікай хіты аўтарства вялікага рокера: тут былі і песні з праектаў «Народны альбом» і «Я нарадзіўся тут», і скарочаная праграма «Белай яблыні грому» — і несмяротныя «Тры чарапахі» і «Паветраны шар». «Цікава, як цяпер Артыруч разрульвае справу з «Шарам» і з «Чарапахамі», калі распаўся N.R.M.? Ці маюць яны права граць гэтыя песні і ці мае ён права?» — спытаўся нехта побач са мной у тлумным клубе. «Ты што! На нацыянальныя гімны аўтарскае права не распаўсюджваецца!» — адрэзаў нехта яму ў адказ. Відаць, юрыст...

«Ці пайду я ў сераду гуляць? — адказаў Вольскі пытаннем на пытанне залы, — Ну як можна? У сераду а 19-й — прэзентацыя Малой медыцынскай энцыклапедыі!»

Такім ненавязлівым піярам ён нагадаў пра іншы культурны прадукт РС гэтага лета — доўгачаканую новую кнігу эсэ Альгерда Бахарэвіча. І калі народ запляскаў яму чарговы раз, дадаў: «Пляскайце, пляскайце... сёння можна!»

Лявон Вольскі ў тым фармаце, у якім ён прагучаў 28 чэрвеня ў Мінску, выявіўся найлепшым антыдэпрэсантам супраць усяго, што адбываецца ў краіне. Шал у клубе стаяў неймаверны: скокі чаргаваліся з воплескамі — і ўсе спявалі — а дакладней крычалі на памяць песні... І ў якасці прыемнага дадатку да канцэрта кожны глядач вынес з сабой дыск з усімі песнямі Рыгора Глыка да Савелія Пстрычкі. Такія імёны носяць vox populi Саўка ды Грышка, прыдуманыя на «Радыё Свабода». Дай жа Божа, каб у новым годзе сябры нарэшце памірыліся і болей не сварыліся. Каб жыццё падказала аўтару менавіта такі варыянт развіцця вобразаў.

ТРАДЫЦЫЯ

# СВЯТА З НАЦЫЯНАЛЬНЫМ КАЛАРЫТАМ

Генадзь КЕСНЕР

**«Ласавацца — не стамляцца!» — такім быў слоган Другога цукеркавага свята, якое 25 чэрвеня, цяпер ужо традыцыйна, прайшло ў гарадскім пасёлку Івянец. Ініцыятарамі і арганізатарамі фэсту сталі вядомая беларуская паэтка, пісьменніца і этнограф Антаніна Хатэнка ды цукеркавая фабрыка «Івкон».**

Распачалося свята на івянецкай Плошчы Свабоды, паміж мясцовым выканкамам і праваслаўным саборам Ефрасінні Полацкай. Дарэчы, Івянец славіцца і сваімі двума вельмі прыгожымі касцёламі — Святога Аляксея (чырвоны касцёл) і Святога Міхаіла (белы касцёл), якія ўваходзяць у так званае «залатое кола» Міншчыны.

Ужо апоўдні на плошчы сабраліся сотні месцічаў і гасцей, якія адмыслова прыехалі на івянецкае «салодкае свята». Іх сустракалі сярэднявечныя ваяры ў рыцарскім рыштунку, маладзёны, апранутыя ў княжацкія строі, а таксама маладыя акторы, пераўвасобленыя ў герояў беларускіх легенд і паданняў, у рознага кшталту нячысцікаў, русалак ды іншых міфічных істот.

Для дзяцей зладзілі гульні з нацыянальным ухілам, з элементамі фальклору. Дарэчы, і дарослыя не стаялі побач, але таксама актыўна далучаліся да дзеяў. Роўна а 15-й гадзіне народ рушыў да сядзібы Пятра Драгунцава. Там ужо іх чакалі рознага кшталту забавы — жадаючыя маглі пагуляць у валейбол, пакідаць баскетбольны мяч у карзіну альбо высветліць, хто мацнейшы, паспрабаваўшы сваю сілу ў армрэслінгу. Дзецям асабліва падабалася біцца з рыцарамі гумавымі дрынамі, і трэба адзначыць, не заўжды рыцары выходзілі пераможцамі ў гэтых баталіях. Тут жа, ля сядзібы, дзясяткі людзей развучвалі беларускія нацыянальныя танцы («Падыспань» ды іншыя), а потым вельмі паспяхова іх выконвалі.





Фота аўтара

Па словах Антаніны Хатэнкі, ідэя фестывалю — «салодкая». «Каб вандроўка ў гісторыю, у такія далёкія паданні, як узнікла гэтае мястэчка, сталася салодкай, казачнай, фантастычнай. На адзін дзень мы апынаемся ў зусім іншым свеце, у свеце мрояў, у свеце надзей, у свеце асалоды, — распавядае спадарыня Антаніна. — На адзін дзень да нас павяртаюцца князі, якія некалі валодалі Івянцом, графы Тышкевічы, якія тут таксама былі валадарамі, а ўсё гэта вядзе пан Драгунцаў — апошні гаспадар сядзібы. Ідэя фэсту прыйшла мне як прыватнай асобе, я прапанавала «Івкону», і яны пагадзіліся. Сёлета фестываль пашырэў, мы зрабілі шмат пляцовак, якія працуюць аўтаномна, і кожны можа абраць сабе па густ тое, што яму даспадобы. Бальшыня з тых, хто тут прысутнічае, гэта моладзь, якая ўжо празнала пра фестываль, якую заманьвае такая ідэя, каб знайсці чароўную цукерыну «Світаль» — а можа, яна заменіць чароўную Папараць-кветку, каб паўплываць на лёс, на вынаходжанне суджанага, на добрую долю, на каханне? Калі мы ямо цукеркі? Калі свята, калі сустрэча, на вяселле. У цукерыну вераць як у такую з'яву вельмі насалодную, радасную, светлую і нават абнадзейную».



Народныя ўмельцы паказвалі, як трэба займацца ткацтвам, разьбярствам і кавальствам, рабіць гліняныя жбанкі, вышываць і плесці. А іншыя адмыслоўцы вучылі гатаваць беларускія нацыянальныя стравы (напрыклад, бліны з мачанкем) і напоі (кшталту крупніка). Адным словам, кожны знайшоў сабе справу па душы. А «Івкон», канешне ж, частаваў усіх сваёй салодкай прадукцыяй.

Бліжэй да вечара пачаўся канцэрт. Сваю творчасць гасцям і месцічам прадэманстравалі як тутэйшыя фальклорныя калектывы, так і музыкі больш сучасных творчых накірункаў — ад чыста этнічнага Пана Скіргайлы з ягонай непаўторнай дудой, «Гуды» да больш сучасных гуртоў — «Acva profundum», «Рэха», «Дзівасіла», «Vain dreams», некаторых іншых. Моладзь танчыла, скочыла і забаўлялася ля вогнішчаў, а завяршылася свята неверагодным па прыгажосці фаер-шоў.

Арганізатары абяцаюць, што Трэцяе цукеркавае свята ў Івянцы абавязкова адбудзецца ў наступным годзе.

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ФРАНЦЫЯ. КАМУНІСТЫ НЕ ПОЙДУЦЬ НА ВЫБАРЫ

Адпаведна вынікам партыйнага галасавання, французская Кампартыя не будзе выстаўляць свайго кандыдата на прэзідэнцкіх выбарах у наступным годзе. За такое рашэнне прагаласавала 60 працэнтаў удзельнікаў партыйнага рэферэндуму. Такім чынам, упершыню з 1974 года камуністы не будуць удзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах. Апошні раз у 2007-м камуністы, якіх прадстаўляла Марыя-Жорж Буфэ, здолелі атрымаць толькі 1,9 працэнта. У наступным годзе камуністы падтрымаюць Жана-Люка Меленхона — лідара «Партыі Левых» (адгалінаванне ад партыі сацыялістаў). Камуністы і левыя даўно ўжо сябруюць у рамках блоку «Фронт Левых», куды акрамя іх уваходзяць яшчэ тузін карлікавых левых груповак.

**Па матэрыялах «Liberation» (Францыя)**

### УКРАІНА. ПАБОІШЧА НЕ БЫЛО

22 чэрвеня ў Львове чакалі вялікага пабоішча. У 70-я ўгодкі пачатку Вялікай Айчыннай вайны камуністы збіраліся правесці ў сталіцы Галіччыны грамадскі трыбунал, які асуджае нацыяналізм. А яўрэйскія арганізацыі хацелі правесці мітынг памяці габрэяў, якія «загінулі ад рук нелюдзяў шухевічаў, бандэраўцаў і іншых фашысцкіх падонкаў». Аднак усё абышлося дзякуючы пазіцыі мэрыі, якая забараніла ўсе як нацыяналістычныя, так і камуністычныя акцыі. Па дадзеных апытанняў, праведзеных напярэдадні 22 чэрвеня, больш паловы жыхароў Львова (61%) былі гатовыя да акцый пратэсту супраць камуністычных правакацый.

**Па матэрыялах «Сегодня» (Украіна)**

### АРГЕНЦІНА. ПРАВААБАРОНЦЫ КРАДУЦЬ

Адна з самых славутых у свеце праваабарончых арганізацый стала ўдзельніцай непрыемнага скандалу. Маці на ўвазе рух «Маці ў белым», які ўзнік у 1970-я гады, у часы вайсковай дыктатуры ў Аргенціне. У той час маці зніклых апазіцыянераў пачалі штотыдзень выходзіць на цэнтральную плошчу Буэнас-Айрэса, маўкліва пратэстуючы супраць рэпрэсій. Усе яны мелі белыя сукенкі, што і дало назву іх ініцыятыве. Пасля краху дыктатуры рух не знік. З'явілася праваабарончая асацыяцыя «Маці з Майскай плошчы», якую актыўна падтрымлівалі ў тым ліку дзяржаўныя фонды. І раптам нечакана высвятляецца, што вялікая частка грошай — 300 мільёнаў долараў — проста знікла. Старшыня асацыяцыі 82-гадовая Эбе дэ Банафіні усю адказнасць перакладае на свайго заступніка Серхіа Шаклендэра, які вядомы сваім шыкоўным ладам жыцця (у Серхіа ёсць нават прыватны самалёт). Пакуль следства не зрабіла канчатковых высноў. Відавочна, што непрыемная гісторыя будзе мець наступствы і для прэзідэнта Крысціны Кіршнер. Крысціна Кіршнер разглядае праблему правоў чалавека як адну з самых істотных у краіне і ахвотна дапамагала арганізацыі «Маці з Майскай плошчы».

**Паводле іспанскай прэсы**

### ВЯЛІКБАРЫТАНІЯ. КРОК ДА НЕЗАЛЕЖНАЙ ШАТЛАНДЫІ

Брытанская Палата Абшчынаў зацвердзіла закон, які надае парламенту Шатландыі больш прэрагатыў у галіне падатковай палітыкі. Адпаведна закону, які завецца «Шатландскі Біль», шатландскі парламент можа ўводзіць лакальныя падаткі і збіраць за кошт іх 12 мільярдаў фунтаў для мясцовага бюджэту. Урад аўтаноміі можа выдаваць дзяржаўныя аблігацыі і ўстанаўліваць памеры асабістага падатку. Праўда, памеры падатку з юрыдычных асобаў дасюль будуць вызначацца цэнтральнымі ўладамі. Міністр па справах Шатландыі, кажа, што сэнс заканадаўства не столькі ў тым, каб павялічыць аўтаномію краю, колькі ў тым, каб зрабіць Эдынбург больш фінансава адказным. Як вядома, Шатландыя дасюль атрымлівае датацыі з цэнтру, што не падабаецца шматлікім шараговым англічанам.

**Па матэрыялах «Wprost» (Польшча)**

### ГРУЗІЯ. ЗАБАРОНЯЦЬ ІМЁНЫ ПА БАЦЬКУ

Прэзідэнт Саакашвілі прапануе грузінам адмовіцца ад імёнаў па бацьку. Такая практыка, на думку ўрадаўцаў, зменшыць нікому не патрэбны бюракратызм. Апазіцыя чамусьці ўхапілася за гэтую тэму. Так, апазіцыйная Лейбарысцкая партыя Грузіі лічыць, што ініцыятыва накіравана супраць нацыянальных каштоўнасцяў, гістарычных традыцый грузінскага народа. Паводле заяў лейбарыстаў, Саакашвілі прыдумаў адмену імёнаў па бацьку з мэтай узурпацыі ўлады.

**Па матэрыялах грузінская прэсы**

### АЎСТРЫЯ. ЦІ ІСНУЕ АЎСТРЫЙСКАЯ НАЦЫЯ?

«Ніхт» (нем.: не), — сцвярджаюць лідары правай папулісцкай Партыі Свабоды Аўстрыі (FPO). У прынятай на днях новай партыйнай праграме чорным па белым напісана: «Мова, культура і гісторыя Аўстрыі ёсць нямецкія». Тым самым партыя далучылася да старой палітычнай канцэпцыі Вялікай Германіі, стваральнікі якой лічылі, што ўсе нямецкамоўныя людзі павінны ўваходзіць у адну дзяржаву. На практыцы такі курс рэалізаваў Адольф Гітлер, пры якім Аўстрыя стала губернатарствам у складзе Трэцяга Рэйху. Пасля вайны незалежнасць Аўстрыі была аднаўленая, аднак, як бачым, архаічныя ўяўленні накont таго, што ніякіх аўстрыйцаў няма, дасюль папулярныя.

**Па матэрыялах «Kleine Zeitung» (Аўстрыя)**

ГЕАПАЛІТЫКА

# МЯЦЕЖНЫ СТЭП

**Алег НОВІКАЎ**

**Казахстан і краіны Сярэдняй Азіі святкуюць 95-годдзе паўстання 1916-га — самага вялікага ў гісторыі мусульманскага паўстання супраць расійскай каланізацыі.**



25 чэрвеня 1916 года расійскі імператар Мікалай II прыняў указ пра мабілізацыю мужчынскага насельніцтва Туркестана і Стэпавага краю ва ўзросце ад 19 да 43 гадоў на прыфрантавыя працы. Усяго капаць акопы ўздоўж лініі фронту з немцамі мусіла 250 тысяч кіргізаў, казахаў, узбекаў і іншых прадстаўнікоў мясцовых народаў.

З самага пачатку гэта была кепская ідэя. Указ выпадкова быў выдадзены ў час святкавання ісламскага свята Рамазана, і, зразумела, быў успрыняты мусульманамі як блюзнерства. Карыстаючыся адсутнасцю ў большасці мясцовага насельніцтва, асабліва ў качэўнікаў, метрык, у пунктах мабілізацыі ўзнікла татальная сістэма хабараў. Было дастаткова самай малой нагоды, каб сітуацыя выбухнула. І такая нагода вельмі хутка знайшлася.

Ёй сталі чуткі пра тое, што капаць акопы заклічуць абсалютна ўсё мужчынскае насельніцтва краю. Хваляванні пачаліся ў Хаджэнце, калі паліцыя адкрыла агонь па маніфестацыі, якая патрабавала знішчэння спісаў мабілізаваных. У адказ пачаліся выступы. Рух прымаў розныя формы: масавыя дэманстрацыі, уцёкі ў глыб стэпаў, у горы, за мяжу, знішчэнні спісаў мабілізаваных, напады на прадстаўнікоў адміністрацыі, партызанскія дзеянні. Неўзабаве паўстанне ахапіла тэрыторыю з больш чым 10-мільённым насельніцтвам. 17 ліпеня 1916 года ў Туркестанскай ваеннай акрузе было абвешчана ваеннае становішча.




Дзеянні Цэнтру насілі самы жорсткі характар. Часта ўзятых у палон расстрэльвалі на месцы. Шырока выкарыстоўвалася артылерыя, кулямёты. Урад быў змушаны накіраваць у рэгіён рэгулярныя войскі, з прыходам якіх увесну 1917 года ўдалося ў цэлым здушыць паўстанне. Каб выратавацца ад помсты карнікаў, прыкладна 500 тысяч кіргізаў і казахаў эмігравалі ў Кітай.

У савецкі час пра паўстанне пісалі дастаткова асцярожна. Было відавочна, што яно насіла яскравы антыкаланіяльны характар. У 1935 годзе выйшла работа гісторыка Рыскулава (яго расстраляюць праз два гады як панцюркісцкага шпіёна), у якой ён прыйшоў да высновы, што паўстанне 1916 года, акрамя царызму, «у першую чаргу было накіравана супраць мясцовых эксплуататарскіх класаў».

Хутка тэорыя Рыскулава была даведзеная да поўнага абсурду. Адпаведна сталінскім інтэрпрэтацыям, паўстанне было ледзь не арганізаванае бальшавікамі ў духу пралетарскага інтэрнацыяналізму. Больш таго, лідары паўстання амаль ад нараджэння былі гэткімі «стыхійнымі» бальшавікамі, якія крок за крокам рухаліся да разумення ідэй марксізму-ленінізму і мудрасці партыі Леніна-Сталіна.

Падзенне Савецкага Саюза і абвяшчэнне незалежнасці сталі пралогам новай трактоўкі падзей 1916 года. Іх зноў сталі разглядаць як вызвольны рух. Аднак з часам адчыніліся новыя цікавыя аспекты тых падзей.

Упершыню пачалі казаць пра рэлігійны фактар. У шэрагу мясцаў, асабліва ў Ферганскай даліне, пагромамі рускіх кіравалі прапаведнікі-дэрвішы з заклікамі да газавату. Лідары паўстанцаў выступалі за стварэнне ісламскай дзяржавы. Духавенства, якое карысталася пры ханскай уладзе вялікімі прывілеямі, стала роўным у правах з усім астатнім насельніцтвам. Мулы разглядалі гэта як свядомы падрыў ісламскіх асноў грамадства, што не магло не выклікаць адпаведнай рэакцыі.

Упершыню сталі казаць пра ролю знешніх разведак. Вядома, што на тэрыторыі Сярэдняй Азіі дзейнічала турэцкая агентура. З тэрыторыі суседняга Кітаю кітайскія нацыяналісты пастаўлялі паўстанцам зброю. У цэлым жа, аднак, паўстанне ні ў якім разе не з'яўлялася вынікам падрыўной дзейнасці нейкіх вонкавых сіл.

Самым вялікім парадоксам можна лічыць пазіцыю партыі Алаш-Арда — казахскай палітычнай арганізацыі, вакол якой аб'ядналіся лепшыя інтэлектуальныя сілы казахаў. Высвятляецца, што нягледзячы на патрабаванне аўтаноміі, большасць алаш-ардоўцаў была супраць паўстання. Яны вырашылі выкарыстаць яго як нагоду, каб пашырыць правы казахаў аж да таго, каб тыя атрымалі правы голасу. Высоўваліся патрабаванні арганізаваць навучанне казахскіх дзяцей на роднай мове са стварэннем для іх інтэрнатаў і пансіянатаў, заснаваць казахскія газеты, спыніць высяленне са спрадвечных земляў і «прызнаць землі, займаныя казахамі, іх уласнасцю». У сваім закліку «Алаштын азаматы» («Грамадзянін Алаша»), апублікаваным 11 жніўня 1916 года, яны пісалі: «Мы хочам сказаць народу — трэба падпарадкавацца. Калі падпарадкаванні ня будзе, калі адмовімся ад указу дзяржавы, якому падпарадкоўваемся, не працягнем рукі дапамогі дзяржаве, і захаваўшы тым самым свае жыцці і хаты, дзяржава на нас не толькі пакрыўдзіцца, але ўжыве сілу».

Як кажуць сучаснікі, алаш-радоўцы вельмі баяліся, што бунт качэўнікаў разбурыць адукацыйную, транспартную інфраструктуру, якая была створаная ў часы расійскай каланізацыі. Паўстанцы сапраўды разглядалі ўсе дасягненні навукова тэхнічнага прагрэсу як прылады, прыдуманыя рускімі для эксплуатацыі. Так, актыўна знішчалася тэлеграфная сувязь. Таксама ў паўстанцаў адсутнічала пазітыўная праграма. Адзіная альтэрнатыўная расійскаму царызму форма дзяржаўнага кіравання, вядомая паўстанцам, — адстала ханства накшталт Бухарскага.

**По слядах паўстання была створаная спецыяльная камісія, якая вывучыла сітуацыю і заключыла, што галоўнай прычынай пратэстаў была палітыка масавай канфіскацыі земляў тубыльцаў. Пра гэта сведчыць геаграфія бунту. Яго эпіцэнтры — раёны з канцэнтрацыяй рускіх**

Царскі ўрад пазней прызнаваў наяўнасць сістэмных прычын для пратэстаў. Па слядах паўстання была створаная спецыяльная камісія, якая вывучыла сітуацыю і заключыла, што галоўнай прычынай пратэстаў была палітыка масавай канфіскацыі земляў тубыльцаў. Пра гэта сведчыць геаграфія бунту. Яго эпіцэнтрамі былі раёны з высокай канцэнтрацыяй рускіх каланістаў. Дарэчы, па выніках працы камісіі дасталося і адміністрацыі. У адстаўку пайшлі 4 губернатары.

Як бы ні было, аднак відавочна, што паўстанне 1916 года стала важнай падзеяй у гісторыі рэгіёна. І як гістарычная з'ява працягвае ўплываць на сітуацыю ў цэнтральна-азіяцкіх краінах, найперш на міжнацыянальныя адносіны, а таксама на адносіны гэтых краін з Расіяй.

ВЫБАРЫ

# ІМПЕРАТАР ІНКАЎ

Алег НОВІКАЎ



**Прэзідэнтам Перу абраны Альянта Умала, актывіст руху, галоўны лозунг якога — адраджэнне імперыі інкаў.**

Ёсць пэўны сімвалізм у тым, што Альянта Умала ўваходзіць ва ўладу (інагурацыя прызначаная на 27 ліпеня) на фоне чутак наконт цяжкай хваробы Уга Чавеса. Апошні накіраваўся на Кубу ў госці да сябра Фідэля, аднак нечакана аказаўся на шпітальным ложку. Афіцыйныя крыніцы кажуць, што аперацыя прайшла добра. Пацыент імкліва ідзе на папраўку. Неафіцыйныя — прагназуюць хуткую смерць Уга. Нават калі разглядаць другі варыянт, амерыканцам, з якімі Чавес заўсёды быў на нажах, няма нагоды радавацца. Вахту лідара лацінаамерыканскай рэвалюцыі можа заступіць Альянта Умала.

Прычым у такім выпадку амерыканцаў будуць крытыкаваць не толькі за тое, што яны імперыялісты. Іх чакае абструкцыя, бо яны маюць белую скуру. Умала вядомы як аматар накірунку Etnocacerisma — палітычнай дактрыны, якая выступае за адраджэнне дзяржавы інкаў (індзейцы называюць яе Tahuantinsuyo), знішчанай іспанскімі канкістадорамі ў XV стагоддзі.

Нягледзячы на тое, што стваральнікам канцэпцыі быў камуніст Ісаак Умала — бацька Альянта — ідэя Etnocacerisma заснаваная на расавай тэорыі. Ісаак Умала патрабаваў перавагі для прадстаўнікоў індзейскай расы над прадстаўнікамі іншых, прынамсі на тэрыторыі Перу. Адпаведна аўтару канцэпцыі, выключна індзейцы маюць гістарычнае права кіраваць краінай. Іншыя пастулаты тэорыі ўключаюць неабходнасць знішчэння Чылі (адзіная лацінаамерыканская краіна, якая не інтэгравала індзейцаў, а знішчала іх, як, напрыклад, племя Арука), стварэння на тэрыторыі Балівіі, Перу і Эквадора, Калумбіі дзяржавы інкаў, легалізацыя спажывання лістоў культуры кокі, з якой робяць какаін, наданне мовы кечуа статусу дзяржаўнай, нацыяналізацыя ўсёй прамысловасці (як вядома, у старажытных інкаў не было інстытуту прыватнай уласнасці, усё належала імператару).

Культавай асобай сярод прыхільнікаў Etnocacerisma з'яўляецца генерал Хуан Веласка Альварада — левы дыктатар, які кіраваў Перу ў 1968–1975 гадах. Таму сярод перуанскіх вайскоўцаў ідэі Etnocacerisma вельмі папулярныя. Менавіта пад лозунгамі Etnocacerisma Умала прыйшоў у палітыку, калі ў 2000 годзе спрабаваў разам з братам узняць мяцеж супраць Альберта Фухіморы. Выступ, хаця і няўдалы, зрабіў Умалу і яго брата героямі нацыі і зноў актуалізаваў стары лозунг ягонага бацькі: «volver al Tahuantinsuyo» — вярнуцца ў імперыю інкаў.

Праціўнікі Умалы ахвотна абвінавачваюць яго ў індзейскім фашызме. Пэўныя паралелі тут сапраўды існуюць. Аднак не ў тым, што першапачаткова прыхільнікі Умалы, як і калісьці нацысты, хадзілі ва ўніформе (пазней і гэта забаранілі). Цяперашняе Перу — гэта эрозія дэмакратыі. Апошняя прэзідэнцкая кампанія стала таму добрай ілюстрацыяй. За парогам першага туру выбараў аказаліся ўсе кандыдаты ад партыйных структур. Сімпатыі электарату атрымлівалі тыя, хто шмат абяцаў. Усяму віной моцная карупцыя.

Зараз у прэсе шмат спекуляцый наконт таго, як Умала збіраецца вяртацца ў тую самую Tahuantinsuyo. Сама ідэя рэстаўрацыі імперыі інкаў выглядае, безумоўна, дзікунствам. Нават тое, што рабіў у 1970-я культавы сярод паслядоўнікаў Etnocacerisma палітык Веласка Альварада, цяжка паўтарыць сёння.

Нагадаем, што Альварада, калі прыйшоў да ўлады, нацыяналізаваў практычна ўсе буйныя прадпрыемствы, перадаўшы іх пад кантроль аднаму дзяржаўнаму органу. У рамках ідэй Peruanismo, якая была абвешчаная дзяржаўнай ідэалогіяй, індзейцам дазволілі вывучаць іх мову ў пачатковых школах. У 1975-м Перу стала першай краінай на кантыненце, якая прызнала мову кечуа дзяржаўнай. Праўда, закон так і не быў рэалізаваны на практыцы. Новая канстытуцыя 1979 года дазваляе выкарыстоўваць кечуа там, дзе большасць насельніцтва размаўляюць на гэтай мове.

**Etnocacerisma набывае новае дыханне. У аб'ектыве крытыкі Умалы падчас выбараў трапілі не «беласкурыя паразіты», а «сталічныя паразіты»**

Спачатку дыктатар талерантна ставіўся да СМІ, большасць з якіх складалі левыя выданні, аднак закончылася ўсё дастаткова банальна: у 1974 годзе ўсе незалежныя або прыватныя рэдакцыі газет, радыё, тэлебачання былі нацыяналізаваныя, а іх уладальнікі дэпартаваныя.

Перу пры Альварада было вялікім сябрам СССР, які пастаўляў сюды зброю. Альварада заявіў пра намер вярнуць землі, захопленыя Чылі ў IX стагоддзі, і ўсур'ёз пачаў рыхтавацца да вайны. Па чутках, нават быў прызначаны дзень нападу — 5 кастрычніка 1975 года. У сваю чаргу, Пінача́т патрабаваў ад Вашынгтону нанесці прэвентыўны ўдар па Перу. Аднак вайны не было, паколькі вайскоўцы, незадаволеныя крахам эканомікі, дабіліся адстаўкі генерала. Праз два гады ён памер. У знак падзякі за тое, што Альварада зрабіў для індзейцаў, тыя сем гадзін на руках насілі яго труну па сталіцы. Дарэчы, калі генерал даведаўся пра путч супраць яго, ён адмовіўся ад улады са словамі: «Перуанцы не павінны забіваць перуанцаў».

Палітыка Альварада ў часы глабалізацыі падобнае на нешта архаічнае. Не кажучы пра немагчымасць рэалізаваць рэваншысцкія патрабаванні на адрас Чылі. Максімум, на думку прэсы, што можна чакаць ад Умалы, нейкіх медыя-кампаній супраць чылійскіх фірм, якія працуюць у Перу. Нельга выключаць таксама дыпламатычных канфліктаў па лініі Санцьяга — Ліма.

Аднак немагчымасць практычнай рэалізацыі канцэпцыі «volver al Tahuantinsuyo» не значыць, што Умала цалкам адмовіцца ад ксенафобскай на адрас крэолаў рыторыкі. Індзейцы складаюць палову насельніцтва краіны і з'яўляюцца моцным людскім рэсурсам. На думку прэсы, Умала паспрабуе праводзіць у гэтай галіне актыўную культурную палітыку, падобную на тую, што праводзіць у суседняй Балівіі Эва Маралес. Там індзейскі кампанент займае вялікае месца ў дзяржаўным працэсе. Дарэчы, Маралес лічыць, што індзейцы не вышэйшая раса над іншымі, а роўная з імі.

Etnocacerisma таксама набывае новае дыханне ў прызме нераўнаважнага развіцця рэгіёнаў і метраполіі. У аб'ектыве крытыкі Умалы падчас выбараў трапілі не «беласкурыя паразіты», а «сталічныя паразіты». Маюцца на ўвазе жыхары Лімы, якія зарабляюць на парадак вышэй, чым правінцыялы. Умала нават выступаў пад слоганам: «Перу супраць Лімы» і абяцаў у выпадку перамогі скараціць разрыў у заробках і стандартах дабрабыту паміж сталіцай і правінцыяй, дзе жывуць пераважна індзейцы.

Іншымі словамі, барацьба за адраджэнне імперыю інкаў, набываючы ўсё новыя формы, працягваецца.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### РАНІЯ ФЕЙСАЛ АЛЬ-ЯСІН



Каралева Іарданіі, жонка караля Абдалы II, якая паходзіць з сям'і палесцінскіх эмігрантаў, — ахвяра ўласнай прыгажосці. Калі яна стала каралеўскай асобай, дзякуючы свайму характву адразу з'явілася на старонках гламурных часопісаў, давала шмат інтэрв'ю, завяла сябе акаўнт на Twitter, на які падпісаліся 600 тысяч фанаў, актыўна ўдзельнічала ў грамадскім жыцці. Усё гэта вельмі не падабалася мясцовым кансерватарам і ўсім аматарам ісламскага шлюбу. Аднак, з улікам таго, што Іарданія — дзяржава аўтарытарнага тыпу, нічога зрабіць яны не маглі. Пакуль арабскі свет не ахапілі пратэсты. Пачаліся яны і ў Іарданіі, дзе праходзяць у тым ліку пад лозунгамі абмежавання публічнай актыўнасці каралевы. Таксама каралеву абвінавачваюць у тым, што яна набывае прадметы раскошы за кошт бюджэтных сродкаў. Калі верыць іспанскай газеце «El Pais», траціна насельніцтва краіны хацела б, каб Яе Вялікасць вяла больш сціплы лад жыцця. Самае цікавае, што амаль палова з іх — палесцінцы, суайчыннікі Раніі. Так ці інакш, на днях манарх паабяцаў, што яго другая палова будзе менш з'яўляцца на публіцы. Між тым, ісламістам гэтага мала. Яны заклікаюць манарха завесці сябе яшчэ адну жонку. А лепш мець іх тры, як, напрыклад, у эміра Катара.

### ФІЛІП ПУТУ




25 чэрвеня рабочага аўтамабільнага завода «Ford» з-пад Бардо, прафсаюзнага актывіста, шляхам унутранага партыйнага галасавання абралі кандыдатам на пасаду прэзідэнта Францыі ад трацкісцкай Новай антыкапіталістычнай партыі (NPA). Парадаксальна, аднак Путу перамог на выбарах, хоць быў малавядомым не толькі на нацыянальным узроўні, аднак і сярод сяброў NPA. Тое, што галасавалі за абы-каго, з аднаго боку, зразумела. Калі сыходзіць з вынікаў апошніх выбараў, то шансаў у Філіпа адназначна няма: на рэгіянальных выбарах увесну NPA атрымала толькі 2,7 працэнтаў. Магчыма, таму адмовіўся ісці на выбары папярэдні кандыдат новых антыкапіталістаў Аліўе Безансно, які, дарэчы, працуе на пошце. На думку палітычных назіральнікаў, падтрымка Філіпа была хутчэй выбарам на карысць захавання іміджу партыі як палітычнай сілы, якая абараняе інтарэсы маладых пралетарыяў. Між тым, песімісты кажуць пра крах праекту NPA, які быў прыдуманы як новая шырокая левая партыя, здольная заняць нішу камуністаў. З 9 тысяч афіцыйных сяброў партыі, толькі 3 тысячы прынялі ўдзел у выбарах кандыдата. Такая лічба набліжае NPA да ўзроўню сярэдняга маштабу трацкісцкай секты.

### ІГАР СМІРНОЎ



З'явіліся чуткі, што Масква кулуарна прапанавала прэзідэнту непрызнанай Прыднястроўскай Малдаўскай Рэспублікі (ПМР) Смірнову добраахвотна адмовіцца ад намеру чарговага пераабрання на пасаду прэзідэнта ПМР (выбары прызначаныя на снежань). У якасці бонусу Смірноў можа атрымаць гарантыі асабістай бяспекі. Смірноў, аднак, прапанову не зразумеў. Або вырашыў пагандляваць. Інакш бы ў Цірасполі не пачалася буйная антырасійская кампанія. Сігналам для «паходу на Маскву» стаў артыкул «Эпоха здрады», напісаны адным з кіраўнікоў прыднястроўскага ўніверсітэта. Галоўны напрамак крытыкі Расіі: амаральнасць расійскіх палітыкаў. Менавіта яна, быццам, стала прычынай таго, што Дзмітрый Мядзведзеў і Ангела Меркель дамовіліся вырашыць прыднястроўскае пытанне. Тую дамову параўноўваюць з пактам Молатава-Рыбентропа. Між тым, мясцовы бамонд лічыць, што Смірнова антырасійская істэрыка не выратуе. Ён сам завязаў усю эканоміку краю на датацыі Масквы. Не кажучы пра наяўнасць у рэгіёне расійскіх вайсковых баз. Прынамсі пакуль ніводная, нават самая лаяльная партыя ПМР, не падтрымала кандыдатуру Смірнова. У такой сітуацыі смірноўцы, магчыма, будуць рабіць стаўку на раскол у крамлёўскай эліце падчас прэзідэнцкіх выбараў у Расіі. Не дарма прыхільнікі Смірнова заявілі пра стварэнне Народнага Фронту — аналага структуры, якую фармуе Пуцін пад сваю выбарчую кампанію.

ДЫЯСПАРА

# ПЁТРА МУРЗЁНАК — БЕЛАРУСКІ

Наталля ГАРДЗІЕНКА

**У Канадзе я выразна зразумела, што апошняя хваля беларускай эміграцыі, адметная, адрозная ад папярэдніх, пачалася не з развалам савецкай краіны (гэтую хвалю можна лічыць перадапошняй). Апошняя хваля пачалася недзе ў 1997 годзе і была справакавана падзеямі ўжо ў незалежнай Беларусі. І выязджаць сталі зусім не з эканамічных прычынаў. Людзі, якія былі прыстойна ўладкаваныя ў краіне, уцякалі ад бесперспектыўнасці і пачуцця сораму за тое, чаму яны вымушаны былі быць сведкамі. Можна сказаць, што менавіта ў гэты час Беларусь згубіла шмат прафесіяналаў высокага ўзроўню. Адным з іх стаў доктар медыцынскіх навук Пётра Мурзёнак.**



Пётра Мурзёнак

## Беларускае мінулае

**Пётра Мурзёнак:**

— Нарадзіўся я 8 мая 1951 года ў вёсцы Дунілавічы на Пастаўшчыне ў Віцебскай вобласці, але дзяцінства і юнацтва правёў у іншай вёсцы — Дварчаны таксама Пастаўскага раёна, дзе мае бацькі працавалі настаўнікамі ў школе. Бацька некаторы час працаваў дырэктарам школы, выкладаў фізіку і матэматыку, а маці вучыла дзетак у пачатковых класах. Па сканчэнні васьмігодкі я вучыўся ў Паставах. У сярэдняй школе толькі адзін раз меў тройку за чвэрць па фізіцы праз складанасці пераходу на іншую мову. Бо ўсё выкладанне ў васьмігодцы было на беларускай мове, а калі прыйшоў у Паставы, там было па-руску, і ўсю першую чвэрць мне было складана прыстасоўвацца да іншай тэрміналогіі.

Пасля я паступіў у Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, вучыўся там шэсць гадоў. Адразу меў імкненне займацца навукай. Таму ад другога курсу, акрамя таго, што вучыўся, я пачаў хадзіць у навуковы гурток, займаўся біяхіміяй. Мяне ўзялі лабарантам на кафедру, каб падпрацоўваць. На шостым курсе, калі трэба было выбіраць спецыялізацыю, я пайшоў у тэрапеўты, бо планаваў займацца навукай і бачыў тэрапію як больш шырокую сферу — базу для навуковых даследаванняў.

Вядома ж, я быў актыўны па жыцці. Усюды займаўся грамадскай працай, ды яшчэ добра вучыўся, займаўся навукай. Таму мяне пакінулі для навукова-даследчай працы ў Мінску, у інстытуце гематалогіі і пералівання крыві. Я стаў працаваць як малодшы навуковы супрацоўнік у гематалагічным аддзеле, а потым — у лабараторыі праблем клетачнай імуналогіі. Там займаўся навукай, зрабіў кандыдацкую дысертацыю. Я яе абараніў у 1981 годзе, калі мне было 30. Дарэчы, у 40 год я абараніў доктарскую дысертацыю, гэта быў 1991 год. Але на той час я ўжо перайшоў у Акадэмію навук (у 1984-м) у Інстытут фізіялогіі, які ў той час узначаліў прафесар Гурын В.М. Ён набіраў новую каманду, і я пайшоў да яго старэйшым навуковым супрацоўнікам. Праз пяць гадоў я ўзначаліў лабараторыю прыкладной фізіялогіі, а праз яшчэ два гады я абараніў доктарскую.

Мая жонка Наталля таксама займалася навукай. Нейкі час мы працавалі разам. Яна абараніла кандыдацкую дысертацыю, кандыдат біялагічных навук. Старэйшы сын скончыў Мінскі медычны інстытут санітарна-эпідэміялагічны факультэт. А малодшы апошні год перад выездам скончыў першы курс міжнароднага радыялагічнага інстытута імя Сахарава. А перад гэтым ён скончыў беларускі гуманітарны ліцэй. Я добра ведаў педагагічны калектыў ліцэя, бо быў намеснікам старшыні бацькоўскага камітэту.

Пасля абароны доктарскай дысертацыі я працаваў, атрымоўваў розныя гранты, пазнаёміўся з прафесарамі замежжа, пісаў лісты, і мяне ўключылі ў еўрапейскую даследчую праграму. Дзякуючы гэтай праграме я, па тых часах, даволі многа ездзіў. На канферэнцыі ездзіў у Францыю, Англію, Галандыю, Германію. Гэта было цікава, і тое была адзіная крыніца, каб напоўніць працу свайго калектыву. Бо сродкаў ужо на гэты час амаль ніякіх не было, і не было з чым працаваць. Нам давалі заробак, выдавалі спірт і вату — і ўсё. Працавалі на старым абсталяванні, на старых запасах. А рэагенты прывозіў той, хто ездзіў за мяжу. Я атрымоўваў гранты, і разам з імі бясплатна розныя рэагенты. Я іх прывозіў, і мы на іх працавалі. Мелі магчымасць зрабіць нейкія эксперыменты і нешта апублікаваць. Спачатку я лічыў, што так, напэўна, і будзе, і я буду ездзіць, знайду мо магчымасць, каб і на заробкі нешта даваць. Насамрэч, магчымасцей працаваць вялікіх не было. І гэта была адна з прычын, якая прымусіла мяне думаць пра тое, што можа варта з Беларусі з'ехаць.

## Канадскае мінулае

**Наталля Гардзіенка:** А якія яшчэ былі прычыны эміграцыі?

**П.М.:** Па-першае, думалася, як нашы дзеці будуць далей, як




Пётра Мурзёнак выступае на святкаванні ў Атаве. 2006 г.

мы зможам ім дапамагчы стаць на ногі. А па-другое — што беларускае адраджэнне скончылася не пачаўшыся, пачаліся захады па славянізацыі, гэтыя рэферэндумы прайшлі. Жудасна ўсё гэта было бачыць і чуць на найвышэйшым узроўні. Агідна.

Ну і яшчэ быў адзін момант. Я ўявіў сабе, што я буду рабіць на пенсіі — буду прадаваць яблыкі з уласнага саду, бо як яшчэ пражыць пенсіянеру? І мне гэта стала неяк вельмі сумна. Я падумаў, а чаму не паспрабаваць яшчэ раз пачаць усё спачатку. І гэта быў такі вялікі выклік, выпрабаванне. Бо калі падумаць пра гэта сур'ёзна, то мы, калі адпраўляліся сюды, усё кінулі. У нас было ўсё. У нас была кватэра, у нас была дача, у нас быў гараж, машына, бацькі ў вёсцы, у нас была добрая праца, дзеці вучыліся ўжо. І на гэтым месцы ўсё кінуць-рынуць і паехаць…

**Н.Г.:** А чаму Вы абралі менавіта Канаду?

**П.М.:** Таму што Канада дазваляла. Яна ўвесь час набірае імігрантаў, прымае 250 тысяч штогод. У іх ёсць спіс прафесій, на якія яны запрашаюць людзей. На той час яны бралі навукоўцаў і нас узялі.

**Н.Г.:** А як Вы тут уладкоўваліся? Вы ехалі на працу ўжо дамоўленую?

**П.М.:** Так, я ехаў на працу. Мы выехалі даволі хутка. Падалі дакументы ў канадскую амбасаду, і нас нават на інтэрв'ю не запрашалі. Нам адразу далі дазвол. І яшчэ з Мінску я пачаў шукаць працу. І мне пашчасціла, з'явіліся дзве прапановы: адна з Вініпегу (але я туды ехаць не захацеў, бо захалодна), а другая — з Атавы. Адзін прафесар напісаў, што мае кантракт быццам бы для мяне на адзін год. Гэта была праца эксперыментальная, дамова з фармацэўтычнай кампаніяй, мы даследавалі ўздзеянне лекаў на жывёлінаў. Гэта была праца для пачаткоўца.

У мяне такі паслужны спіс быў, што я прафесар, доктар навук і г.д., я прыйшоў да таго прафесара праз два тыдні пасля прыезду. Першае, што ён у мяне запытаўся: «Што ты для мяне можаш зрабіць?» Я яму пачаў расказваць, які я добры і разумны, што я рабіў. «Не, — ён кажа, — што ты можаш для мяне зрабіць?» Давялося мне папацець, даказаць, што я магу быць для яго карысны. Я чамусьці думаў, што ён мяне адразу возьме. Урэшце дамовіліся, і мне далі пазіцыю research fellow. Гэта такое, каб не пакрыўдзіць, як бы даследчык-стажор. У мяне быў мізэрны заробак, і я працаваў там ад «а» да «я». Гэта было тое, з чаго я калісьці пачынаў, ад працы з жывёламі, ад вымярэнняў, ад вядзення пратаколаў. Звычайная навуковая праца, але прыйшлося закатаць рукавы, бо гэта была мікрахірургія, з якой я раней мала сутыкаўся. І першыя два месяцы былі для мяне вельмі складаныя.

А яшчэ ж ніхто не працаваў у сям'і, акрамя мяне. Жонка з сынам пайшлі вучыць англійскую мову, а малодшага сына прынялі ва ўніверсітэт. То першы год я вельмі шмат і цяжка працаваў. Тым не менш па выніках працы я напісаў і апублікаваў у прыстойных журналах два артыкулы. Гэта было даволі ўдала. А потым я знайшоў падобную працу, але крыху ў іншай галіне, стаў займацца імуналогіяй, чым і ў Беларусі займаўся. І заробак паднялі. На новым месцы я працаваў чатыры гады. Была магчымасць паездзіць зноў на канферэнцыі, быў у Шатландыі, Італіі, Амерыцы. Тэзісы нейкія пісаў, артыкулы.

Потым мяне бралі на працу ў Health Canada [кшталту Міністэрства аховы здароўя — Н.Г.] — ва ўрадавую арганізацыю. Але раптам прыйшоў запыт на мяне на вельмі добрую пасаду на старэйшага навукоўца-імунолага адной кампаніі. Я прайшоў інтэрв'ю на розных узроўнях і год працаваў там, гэта было вельмі цікава. А пасля вярнуўся назад у Health Canada, дзе займаўся ацэнкай новых лекаў, што паступаюць на канадскі рынак. Цяпер мяне запрасілі ў Statistics Canada [кшталту Міністэрства статыстыкі — Н.Г.], тут працую ў вялікім даследаванні, і гэта вельмі цікавая праца, якая дае мне каштоўны вопыт. Такім чынам я працую па спецыяльнасці, і Наталля (жонка) таксама працуе па спецыяльнасці ў Health Canada, і работай мы задаволеныя. Я як навукай займаўся, так і займаюся. Бо трэба ж выкарыстоўваць свой багаж.

Мне ўжо 60 гадоў, але яблыкі я прадаваць не збіраюся, і на пенсію таксама не іду, бо трэба працаваць. Мы занадта позна прыехалі сюды, каб у нас усё было для пенсіі. Яна яшчэ будзе маленькай.

**Н.Г.:** Што было самае складанае для Вас у Канадзе?

**П.М.:** Яно мо і зараз самае складанае… Я не магу сказаць, што адчуваю сябе чалавекам другога гатунку, але... Я сустракаўся з многімі імігрантамі першага пакалення. Прыкладам, адзін егіпцянін скардзіўся: «Я пражыў тут 35 гадоў, і я адчуваю сябе чалавекам другога гатунку». Хаця ён даволі паспяховы, у яго і бізнэс тут свой. Але яму ў твар казалі: «А чаго ты сюды прыехаў?» І я сам размаўляў з прафесурай, з разумнымі людзьмі, прадстаўляўся, хто я такі, і мне таксама часам казалі: «А чаго ты сюды прыехаў? Мы цябе сюды не звалі». І тым не менш Канада, па-мойму, найлепшая краіна для эмігрантаў.

Напачатку было цяжка. Адчуванне, што ты адзін на барыкадах, і каб выжыць тваёй сям'і, ты павінен рабіць тое, за што ўзяўся. Мне было вельмі цяжка ў першыя два месяцы. Я ішоў на працу ў восем раніцы, а вяртаўся ў адзінаццаць вечара. І раніцай зноў, і зноў, і зноў. Бо былі вельмі складаныя аперацыі, пакуль я навучыўся іх рабіць, і адказнасць, і ціск такі. Пацук загінуў, дык не паспееў ты дайсці да верху, ужо прафесар ведае і пытае: «А што здарылася?», бо ўжо яму паведамілі. І за кожнага ты павінен адказваць, за дадзеныя, што ты зрабіў.

Я не кажу, што гэта дрэнна, тое нармальна і прымушае людзей працаваць, і на гэтым тут усё пабудавана. Таму тут людзі адказныя. Яны адказваюць за свае словы, за свае дзеянні. І вынік іншы. У нас людзі свабадней, чым тут, у нейкім сэнсе, вольныя птушкі, што хачу, тое раблю, а не хачу, дык не раблю. Фактычна людзі не зацікаўленыя ў выніках сваёй працы ці іх не бачаць. А тут — не, тут ты павінен працаваць. Таму што ў цябе сям'я, таму што табе на пенсію трэба зарабіць, таму што ў цябе абавязак перад банкам і г.д. Тут яшчэ і інстытут рэкамендацый дзейнічае. Калі ты недзе наслядзіў, то гэты след пойдзе з табою далей. Таму людзі зацікаўлены, каб добра працаваць. Як добра працуеш, то гэта заўважаць і ацэняць. Добрая праца спрыяе твайму росту і тваёй кар'еры.

## Канадска-беларуская рэчаіснасць

**Н.Г.:** Калі і як Вы сустрэліся ў Канадзе з беларусамі?

**П.М.:** Недзе ў 1999 годзе мы трапілі на нейкае мерапрыемства, дзе пазнаёміліся з Івонкай Сурвілай і іншымі беларусамі. І адтуль пайшло. Мяне прапанавалі зрабіць старшынёй Атаўскага аддзелу Згуртавання беларусаў Канады (ЗБК). Тады гэты аддзел — мо чалавек 20, што прыходзілі на мерапрыемствы. Паступова сталі знаёміцца, нарошчваць кола ўдзельнікаў.

У 2001 годзе мяне абралі ўжо на старшыню ўсяго ЗБК, і я быў

# НАВУКОВЕЦ У КАНАДЗЕ

на гэтай пасадзе да 2005-га. Што я паспеў зрабіць? З маёй ініцыятывы быў створаны сайт ЗБК, быў перагледжаны Статут арганізацыі. Былі, праўда, і няўдалыя спробы аднавіць дзейнасць беларусаў у Вініпегу і арганізаваць у Ванкуверы. Цяпер я далей працягваю беларускую працу ў Атаве.

**Н.Г.:** Якія Вы можаце адзначыць найбольш запамінальныя беларускія падзеі тут?

**П.М.:** Для мяне заўсёды было важным зрабіць свята 25 сакавіка, каб гэта было прыгожа, запамінальна. Адзін год мы нанялі Сіці-хол, вялізную залю. Прыехалі «Яваровыя людзі» з Таронта, зрабілі вялікі канцэрт, чалавек 80 прыйшло на гэтае свята. А перад тым мы зрабілі яшчэ маніфестацыю за дэмакратычную Беларусь, прайшлі па цэнтры горада. Гэта была значная падзея, якая аб'яднала беларусаў Таронта, Атавы і Манрэаля. Калі я быў старшынёй ЗБК, я стараўся злучыць беларусаў, каб супольна працаваць. І мне здаецца, што гэта атрымалася.

**Н.Г.:** Кожны беларускі асяродак у свеце па-свойму адметны. У чым асаблівасці беларускай грамады ў Атаве?

**П.М.:** Я думаю, першае адметнае для нашай грамады тое, што гэта вельмі адукаваныя людзі, і ў прафесійным, і ў культурным, эстэтычным плане. Хтосьці піша вершы, хтосьці грае на музычных інструментах, хтосьці малюе. І мы адрозніваемся ад былой эміграцыі. Мы зусім іншыя людзі. Мы імкнёмся аб'яднацца найперш на культурнай глебе, а потым ужо палітычны фактар можа далучыцца. І гэта апошнае агульнае для беларускіх суполак не толькі ў Атаве.

Ёсць можа 2–3 працэнты людзей палітычна ангажаваных і гатовых тут за нешта змагацца. Але большасць — не. Але ўсе тыя, што збіраюцца разам, гэта мо 5 працэнтаў ад усіх беларусаў, што жывуць у Канадзе. А тыя 95 працэнтаў наогул нічога не цікавіць.




Беларуская дэманстрацыя ў Атаве. Сакавік 2006 г.

У Атаве жывуць каля тысячы беларусаў, большасць іх занятыя ў кампутарнай галіне. Да нас на імпрэзы прыходзіць каля 70. Гэта пераважна эміграцыя 1997–2000-х гадоў. З ранейшых толькі Івонка Сурвіла. Былі некалькі чалавек з эміграцыі пачатку 1990-х, якія тады прыехалі на стажыроўку і тут засталіся. Але яны зусім савецкія людзі. Яны не жылі ў незалежнай Беларусі. Для іх важныя бярозкі, Ала Пугачова… Яны да нас не ходзяць, бо не разумеюць.

**Н.Г.:** Я так разумею, што сваім жыццём у Канадзе Вы задаволены. Ці ёсць жаданні, якія Вы на сёння яшчэ не рэалізавалі?

**П.М.:** Я пішу вершы, рыхтуюся выдаць кнігу. Адна невялічкая ў мяне ўжо ёсць. Напісана ў 2000 годзе. Хачу цяпер выдаць лепшае. Я пачаў пісаць яшчэ ў Беларусі, але там амаль не друкаваўся (позна пачаў). Апошнія гады я вельмі мала пісаў. Бацька быў вельмі хворы. І цяпер мне хацелася б яшчэ пісаць. Гэта, бадай, найгалоўнае.

З іншага я, здаецца, шмат рэалізаваў. Я маю пасаду, якая мяне задавальняе. Хочацца і далей займацца навукай. У мяне ёсць каля 160 розных публікацый. Але ёсць жаданне працаваць далей. Быў бы задаволены, калі б гэта атрымалася.

І хацеў бы яшчэ патрапіць у Беларусь, калі там зменіцца ўлада.

## ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

«Пакутныя крыжы Беларусі» — цыкл нарысаў журналісткі Таццяны Уласенкі, якія мы з лістапада 2010 года друкуем на старонках нашай газеты. Такіх крыжоў, пастаўленых на могілках і месцах масавых пахаванняў у новыя часы, шмат у Беларусі. Адны іх усталёўваюць і бароняць. Іншыя — выкарчоўваюць, паляць, знішчаюць. Пра вечнае супрацьстаянне грамадскасці з вандалізмам — аповед Таццяны Уласенкі. Мы надрукавалі ўжо 8 нарысаў, якія выклікалі інтарэс і пазітыўныя водгукі. Але на апошні з іх — «Крыж распятай Губы» («Новы час», №22 ад 3 чэрвеня 2011 г.) — прыйшоў і водгук рэзка адмоўны. Прычым ад адной з галоўных дзеючых асоб нарыса, на чые сведчанні і ацэнкі абапіраецца аўтар, ад пісьменніцы Алены Рыгораўны Кобец-Філімонавай — аўтара кніг «Жаваронкі над Хатынью» і «Распятая Хатынь».

Калі мы рыхтавалі нарыс «Крыж распятай Губы» да друку, то для нас з яго Алена Рыгораўна паўставала як асоба, як чалавек і пісьменніца, што мела гонар і мужнасць змагацца за гістарычную праўду яшчэ ў савецкія часы. Тым больш, што Таццяна Уласенка ў артыкуле абапіралася на вытрымкі з кніг пісьменніцы, магнітафонны запіс размовы з ёй. Але сама Алена Рыгораўна ўспрыняла нарыс па-іншаму. Якая ж складаная і балючая гэта тэма — вайна! Як па-рознаму яна ўспрымаецца! Як супярэчліва перакрыжоўваюцца і сутыкаюцца ў палітыцы, у жыцці, у нашай свядомасці старыя стэрэатыпы і спробы пераасэнсавання, здавалася б, усю такіх даўніх падзей. І наколькі ж выспела неабходнасць іх аб'ектыўнага даследавання і асвятлення, пры самым талерантным стаўленні да розных ідэй і меркаванняў.

З павагі да А. Р. Кобец-Філімонавай мы друкуем яе ліст у рэдакцыю ў аўтарскай версіі, з захаваннем стылю і арфаграфіі. Ну а чытачы маюць магчымасць пры жаданні звярнуцца да нарысаў Таццяны Уласенкі і скласці сваё ўяўленне.

**Аляксей Кароль**

# КРЫЖ НА ЎЗЛЕСКУ

Не ведаю, па чыёй ініцыятыве зроблены замах на мае кнігі, прысвечаныя шматпакутнай Хатыні і іншым беларускім вёскам з аналагічным лёсам, і таму называю толькі выканаўцу, маладую журналістку Таццяну Уласенка.

Трэцяга чэрвеня, пасля сустрэчы са мной, яна надрукавала артыкул «КРЫЖ РАСПЯТАЙ ГУБЫ» памерам на адну газетную старонку. На вялікі жаль, яна не паказала мне, як абяцала, рукапіс з маім аповедам, і публікацыя аказалася скажонай дый не па тэме. Яна ж прасіла расказаць пра невядомую вёсачку Губа, а не пра Хатынь, пра якую ўсе добра ведаюць.

У артыкуле мне прыпісана шмат слоў, якіх я не казала, выказаны «мае думкі», якіх я не выказвала. У выніку я, аўтар кніг «Жаваранкі над Хатынню» і «Распятая Хатынь», са старонкі газеты «Новы Час» выглядаю ледзь не фашысткай і недасведчаным аўтарам, які ўзяўся пісаць пра тое, чаго не ведае.

Прывяду цытаты з фактычнымі памылкамі і непісьменныя з артыкула журналісткі.

1. «КРЫЖ РАСПЯТАЙ ГУБЫ». /Назва артыкула вельмі няўдалая, тым больш, што вёсачка «Губа» аўтар присвяціў літаральна некалькі радкоў, астатнее — пра Хатынь/.

2. «Савецкія партызаны». /Паўтараецца бясконца, быццам іншых эпітэтаў няма. Дый тэрміналогія не сучасная і не мая, я ніколі не называла партызан «савецкімі». Раз змагаюцца ў савецкай Беларусі, значыць, савецкія.

3. Назва маёй кнігі «Жаваранкі над Хатынню», а не «Жаўрукі над Хатынню». /Ці ж я не ведаю назвы сваіх кніг?/.

4. «Па замове маскоўскага выдавецтва...» /Замова — заговор, напрыклад, чараўніка — А.К.-Ф./. Можа Таццяна Уласенка мае на ўвазе «дагавор», дык яго паміж выдавецтвам і дырэктарам музея Айчыннай вайны не было. Я такога не казала.

5. «/цытата з дакументальнай кнігі «Распятая Хатынь»/». Гэтыя словы як быццам кажу я, абрываючы свой аповед. Не разумею, як гэта... Дый ніякіх цытат са сваёй кнігі журналістцы я не чытала.

6. «... мы можам толькі здагадвацца, колькі беларуская насельніцтва сталі ахвярамі з-за іх неабдуманых і цынічных дзеянняў». /Такіх абагульняючых слоў пра партызан я не казала і не пісала. Гэта яўны на мяне паклёп! Каб настроіць супраць мяне ўсіх партызан/.

7. Пра легендарнага Камінскага і нейкіх рэцэнзентаў, якіх нешта не задавальняла, таксама прыдумка журналісткі, мусіць, спісала з буклета ці з чыёй-небудзь публікацыі. Акрамя рэцэнзіі дырэктара музея Лавецкага, які забараніў выдаваць маю кнігу /але Масква аказалася непаслухмянай/, ніякіх рэцэнзій з іх рэцэнзентамі я не ўзгадвала.

8. «шмат хатынскіх сем'яў былі паліцэйскімі». /У Хатыні было 8, а не «шмат». На 26 двароў не так ужо і многа. І таму я не казала гэтых слоў.

9. Зноў журналістка нібыта прыводзіць мае словы: «У прыватных гутарках з жыхарамі мне стала вядома, што паліцэйскія сем'яў, якія ненавідзелі савецкіх партызан, было шмат — і ў Хатыні, і ў Вялікай Губе, і ў іншых мястэчках».

Па-першае, я не магла назваць глухія лясныя вёсачкі Хатынь і Губу мястэчкамі. Гэта факталагічная памылка.

Па-другое, такіх абагульненняў пра вялікую колькасць паліцэйскіх у нашых вёсках я не рабіла.

10. «І ён /Камінскі/ не добра ставіўся да партызан». /Не мае словы/.

11. «Менавіта ён /Камінскі/ данёс на партызан». /І гэтыя словы належаць аўтару «чарнухі» Т. Уласенка, а не мне. Народныя пагалоскі не трэба прыпісваць мне. Да гэтага часу невядома, хто данёс на партызан/.

12. «Жыхары суседніх вёсак катэгарычна адмаўляліся распавядаць мне сапраўдную гісторыю знішчэння вёскі /Хатыні/. Блыталіся ў фактах, хлусілі, адмоўчваліся». /Падкрэсленыя мною словы, не мае. І тут фантазія журналісткі, як быццам хто ёю кіраваў/.

13. Пра другую жонку Камінскага і савецкую прапаганду зноў жа з легендарным Камінскім — таксама не маё.

14. «Падчас збору інфармацыі пра Хатынь пісьменніцу арыштоўвалі як шпіёнку, чакалі дыверсій з яе боку...» /Такое было, мяне затрымаў хатынскі міліцыянер, быў і допыт. Але ці не перастаралася журналістка? Зграбла ў кучу ўсё, што было і чаго не было. Чым больш «чарнухі», тым лепей. Каму гэта трэба?/.

15. Чым глыбей у лес — тым болей дроў. Калі верыць журналістцы, гэта я сказала: «Сяляне сталі ахвярамі кароткага бою». /Не сяляне, даражэнькая Таццяна, а немцы і паліцаі, якія вялі бой з партызанамі каля вёскі Губа. А сялян-лесарубаў расстралялі пазней/.

16. Не радуйсувязь, а тэлефонная сувязь. /І гэта факталагічная памылка прыпісана мне!/.

17. Героя Савецкага Саюза Цімчука я нідзе і ніколі не называла фамільярна Іванам, а Іванам Цімафеевічам ці проста Цімчуком.

18. Журналістка часта паўтарае: «распавядае пісьменніца». Дык пра што ж я яшчэ распавядаю? А вось пра што... «Былы камісар атрада «Мсціцель», герой Савецкага Саюза Іван Цімчук мне распавёў, што гэта вёска /невядома якая — А.К.-Ф./ стала ахвярай расправы і нацыстаў і савецкіх партызан. У вёсцы жылі напалову сем'і і тых, і другіх». /У беларускіх вёсках сем'і нацыстаў не жылі! Гэта грубейшая палітычная і факталагічная памылка. Такога не мог сказаць ні Цімчук, ні я, перажыўшая вайну. А малады чытач паверыць гэтай псеўдаінфармацыі і зробіць такі вывад: у беларускіх вёсках у час Другой сусветнай вайны жылі партызанскія сем'і, паліцэйскія і... нацысцкія! Віват, Алена Кобец-Філімонава! /І гэта мне прыпісалі, хай людзі думаюць, што гэта я напляла бязглуздзіцу/.

19. Заканчваецца артыкул словамі /дзякуй Богу, не маімі, а журналісткі: «Калі ж будуць асуджаны камуністы, якія прымалі ўдзел у забойстве сваіх жа грамадзян?» /Гэта не мае словы і мне іх не прыпісвалі. Але ўсё роўна людзі падумаюць, што гэта я сказала. А як жа! Хай не толькі савецкія партызаны, не толькі беларускія сяляне, але і камуністы мяне ненавідзяць!

/І гэта ў артыкуле, дзе расказваецца, як немцы і паліцаі спалілі Хатынь. Прычым тут камуністы?/.

На жаль, падчас сустрэчы з журналісткай Таццянай Уласенка я адмовілася даваць ёй інтэрв'ю, выкарыстоўваючы дыктафон, спадзеючыся, што прафесійны журналіст здолее пісьменна перадаць мае думкі, аддзяляючы іх ад сваіх суб'ектыўных каментарыяў. Безумоўна, кожны чалавек мае права і на сваю ўласную думку. Гэтаксама і журналісты.

Але Таццяна Уласенка ў сваім артыкуле апісала падзеі, пра якія ішла размова, не толькі сваімі словамі, але і ў сваёй інтэрпрэтацыі. Да таго ж напісала многа чаго ад сябе /тое, пра што са мной не было і гаворкі/.

А яшчэ большая яе памылка ў тым, што ўвесь матэрыял пададзены ў выглядзе інтэрв'ю, простай мовы. Атрымліваецца, што словы, пазначаныя ў артыкуле як простая мова, — на самой справе я не гаварыла і не пісала. І адкуль яна ўзяла скажоныя факты, напрыклад, пра Хатынь — невядома. Па сутнасці, яна ўзяла інтэрв'ю ў самой сябе /ёсць такі жанр/, але замест сябе падставіла мяне. Такое ў практыцы журналістаў не дазволена.

**P.S.** Ці спрыяюць іміджу паважанай газеты падобныя публікацыі, пабудаваныя на плявузганні і домыслах непрафесійных аўтараў, якіх нельга назваць журналістамі?.. І ці не кашчунства — так агрэсіўна ставіцца да памяці бязвінна загінуўшых людзей?

У «Народнай Волі» за 20–30 сакавіка 2009 г. надрукаваны мой артыкул «Жудасная трагедыя» пра вёсачку Губу, пра жудасную смерць яе жыхароў. Хай чытаюць людзі ГЭТЫ РЭКВІЕМ.

Прашу надрукаваць маё абвяржэнне на артыкул Таццяны Уласенка з недарэчна-цырквавай назвай «КРЫЖ РАСПЯТАЙ ГУБЫ». А маё абвяржэнне назваць — «Крыж на ўзлеску».

Перад публікацыяй прашу ўзгадніць са мной адрэдагаваны тэкст (і змясціць у інтэрнэт).

**Алена Кобец-Філімонава,**
**23 чэрвеня 2011 г.**

ФЭСТ

# МУЗЫ ВЯРТАЮЦЦА Ў НЯСВІЖ

Аляксей ХАДЫКА

**З 24 па 26 чэрвеня ў Нясвіжы ўжо другі год запар прайшоў летні фестываль опернага і балетнага мастацтва «Вечары Вялікага тэатра ў замку Радзівілаў».**





З'яўленне open-air класічнага музычнага і тэатральнага фестывалю ў Нясвіжы, які адразу зрабіўся рэзананснай з'явай у культурным жыцці краіны, менавіта зараз цалкам заканамерна. Падыходзіць да заканчэння першая 15-гадовая стадыя рэстаўрацыі і рэканструкцыі замка (фармальна — 1 ліпеня). Плынь турыстаў, насуперак вельмі беднай турыстычнай інфраструктуры — гасцініцы, рэстараны, клубы, выставачныя залы, нават кнігарні і сувенірныя шапікі ў відавочным дэфіцыце — у Нясвіжы ўжо пару гадоў перавышае лічбу ў 200 тысяч. Ды і наш Вялікі тэатр, яго оперная і балетная трупы, ужо з 1990-х гадоў маюць шматразовы досвед удзелу ў фестывалях на адкрытым паветры: у швейцарскім Салатурне, у нямецкіх старых гарадах. Менавіта палацава-замкавыя ансамблі, якія ствараюць натуральныя жывыя дэкарацыі пастановак, робяцца асяроддзем правядзення папулярных ва ўсёй старой Еўропе тэатральна-музычных імпрэз open-air. Нясвіж ідэальна пасуе для падобных мерапрыемстваў. Яго ўласныя гаспадары, Радзівілы, стагоддзі таму практыкавалі шматлікія пастаноўкі на адкрытым паветры: і ў паркавых тэатрах, і на замкавых валах, і ў дворыку палаца.

Па словах аднаго з арганізатараў фестывалю, дырыжора Вялікага тэатра Вячаслава Воліча, які шмат зрабіў дзеля ўвасаблення ідэі аднаўлення музычных імпрэзаў, у Нясвіжы выдатная акустыка. Сёлета маэстра дырыжыраваў пастаноўкай опернага спектаклю ў 2-х дзеях «Дзікае паляванне караля Стаха» Уладзіміра Солтана паводле аднайменнай аповесці Уладзіміра Караткевіча. П'еса, якая за 27 гадоў сваёй гісторыі ўжо гучала на адкрытым паветры (у Траецкім прадмесці), аздобленая кампутарнымі эфектамі, што пераўтвараюць прастору двара ў містычна-гістарычнае асяроддзе, слухаецца і глядзіцца ў нясвіжскім замку з асаблівай выразнасцю.

Увесь Нясвіж у дні фестывалю пераўвасабляецца ў вялікі тэатр — рознакаляровыя групы турыстаў змешваюцца з купкамі актораў у касцюмах, насычаючы паветра горада духам мастацкай падзеі. Варта спадзявацца, што імкненне фундатараў імпрэзы, сярод якіх побач з Вялікім тэатрам стаяць уласна музей-запаведнік «Нясвіж», дзяржаўная тэлерадыёкампанія і абласны з раённым выканкамы, зрабіць з цягам часу з трохдзённага фестывалю тэатралізаваную праграму на цэлы турыстычны сезон калісьці рэалізуецца.

Ужо зараз фестываль аб'яднаў некалькі пляцовак — у замку апрача «Палявання» ў мінулыя выходныя давалі два канцэрты салістаў Вялікага тэатра і аднаактавы балет Людвіга Мінкуса «Пахіта». У Ратушы пад акампанемент струннага квінтэта «Серэнада» прагучалі рамансы. А ў Фарным касцёле, створаным, як і замак, напрыканцы XVI стагоддзя геніем італьянскага архітэктара Яна Марыі Бернардоні і яго натхняльніка Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі — араторыя «Жальбы» Ігара Хадоскі.

Апошняя зрабілася цвіковай падзеяй не толькі з-за прэм'еры. Некалькі гадоў таму кампазітар Ігар Хадоска звёў у адзіны твор, Пасьён-Араторыю, беларускія царкоўныя спевы, жальбы-галашэнні, якія з рукапісаў XVII–XVIII стагоддзяў у нашай краіне захаваліся каля трох дзясяткаў, дапоўніўшы іх нязначнымі фрагментамі сучаснай музыкі. У адрозненне ад еўрапейскіх пасьёнаў — жанру, які пачаў развівацца з раннехрысціянскіх часоў і дасягнуў вяршыні ў творчасці Ё.С.Баха, — твор Ігара Хадоскі абмяжоўваецца эпізодам Галгофы і Укрыжавання. А разгорнутыя еўрапейскія версіі пачынаюцца ад Тайнай вячэры і доўжацца да пахавання Хрыста. Але і «кароткі» беларускі варыянт настолькі ўразіў прысутную публіку шчырым пачуццем музыкі і словаў Рыгора Бараруліна, да якіх быў дапасаваны музычны матэрыял, цыклічным нарастаннем пачуццяў у паўторных партыях Марыі Магдаліны (выдатнае сапрана Алены Золавай), Божай Маці (меца-сапрана Наталлі Акінінай), апосталаў Пятра (барытон Сяргея Лазарэвіча) і Яна (беларускі топ-тэнар Юрыя Гарадзецкага), што многія прысутныя выцiралі слёзы.

Міністр культуры Павел Латушка абсалютна слушна адзначыў, што атмасфера гістарычнага Нясвіжа самой гісторыяй народжана для правядзення тэатральна-музычнага фестывалю.




Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
**Кароль Аляксей Сцяпанавіч**

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 716

Падпісана да друку 1.07.2011. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.